№№113–114
(2633–2634)

19 ліпеня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

ПАЛІТКУХНЯ

Кожны рухаецца па-свойму

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы і ствараемы рух Аляксандра Мілінкевіча "За свабоду!", у рэшце рэшт, вызначыліся — якім фронтам яны пойдуць на парламенцкія выбары.

Адразу варта адзначыць, што ўсе прымуць удзел у перадвыбарнай кампаніі. Праўда, калі АДС будуць выстаўляць сваіх кандыдатаў на выбары, то Мілінкевіч са сваёй камандай ад такой тактыкі адмовяцца. Зрэшты, паслухаем, што кажуць "аўтары".

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі:

— На пасяджэнні Палітсавета Аб'яднаных дэмакратычных сіл мы падпісалі пагадненне аб прынцыпах удзелу ў палітычнай кампаніі выбараў у парламент. Зараз ён павінен быць ратыфікаваны кіруючымі органамі суб'ектаў кааліцыі. Галоўны вынік — тое, што гэтым пагадненнем мы стварылі палітычныя і прававыя рамкі, у якіх зараз будзе ісці падрыхтоўчы працэс. Вельмі важна, што АДС ідуць на гэтую кампанію адной калонай. Закладзены прынцып: ад адной акругі — адзін кандыдат АДС. Гэта азначае, што кандыдатаў можа быць менш чым 110, але ні ў якім разе не больш. Што тычыцца ствараемага руху "За свабоду!"... Спадар Карніенка заявіў, што яны не ставяць сваёй мэтай барацьбу за ўладу, а сканцэнтруюць свае сілы на змяненні ўмоў правядзення выбараў. Добра! Гэта таксама ёсць пэўная спецыялізацыя.

Віктар КАРНІЕНКА, намеснік старшыні ствараемага руху "За свабоду!":

— Разумееце, мы катэгарычна супраць, каб Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы абмежаваліся звыклай формулай "Схадзілі да людзей". Гэтыя паходы да людзей не даюць аніякага плёну, калі няма прапаноў, калі людзі не адчуваюць, што гэта для іх карысна. Намі ж пастаўлена задача, каб у Беларусі адбыліся дэмакратычныя выбары па стандартах АБСЕ. Вось гэтую мэту мы і будзем вырашаць падчас парламенцкіх выбараў. Мы абавязкова будзем удзельнічаць у кампаніі, і на сённяшні дзень вызначана некалькі такіх накірункаў. Першы — будзем сур'ёзна займацца вылучэннем прадстаўнікоў дэмакратычнай грамадскасці ў выбарчыя камісіі і ў першую чаргу ва ўчастковыя. Акрамя таго, можам удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, якія будуць спрыяць дэмакратызацыі будучых выбараў. Да таго ж мы абавязкова падтрымаем тых кандыдатаў, якія вартыя гэтай падтрымкі.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПАМЯЦЬ

Недапісаная кніга Георгія Таразевіча

Гэты чалавек пасля распаду СССР мог жыць без вялікіх турбот, займаць адпаведныя ягонаму высокаму наменклатурнаму рангу пасады і мець выцякаючыя з гэтага даброты. А потым, атрымаўшы адпаведную гэтаму рангу пенсію, пайсці на заслужаны адпачынак.

Але спакойна жыць ён не ўмеў. Відаць, яшчэ з часу даволі драматычных экспедыцый па Саюзе ў гады маладосці (па прафесіі ён быў геадэзістам) гэты чалавек прывык да рызыкі, барацьбы. Таму, бадай, і ўстаў у свой час у шэрагі апанентаў уладам, хаця, здавалася б, не было яму чаго з імі дзяліць.

Размова ідзе пра Георгія Станіслававіча Таразевіча — вядомага дзяржаўнага і палітычнага дзеяча Беларусі і былога СССР, якому 17 ліпеня гэтага года споўнілася б 70 гадоў. У свой час ён быў старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснікам старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, старшынёй камісіі Вярхоўнага Савета СССР. З 1993 года Таразевіч 1-ы намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Завяршыў ён сваю кар'еру на пасадзе Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча.

Маё знаёмства з Таразевічам адбылося на пачатку 1999 года, падчас працы ў часопісе "Беларусь". Я рабіў тады для свайго выдання экспрэс-апытанне сярод вядомых палітыкаў на тэму: "Што для вас значыць нашая незалежнасць?" і папрасіў Георгія Станіслававіча выказаць сваё меркаванне на гэты конт па тэлефоне. На што ён адказаў, што жыве побач з рэдакцыяй і мог бы на некалькі хвілін зайсці...

"Некалькі хвілін" размовы з Георгіем Станіслававічам зацягнуліся больш чым на тры гадзіны.. Таразевіч выявіў сябе чалавекам выдатным і надзвычай кампетэнтным. Вынікам тае сустрэчы стаў вялікі матэрыял у "Беларусі". Пасля гэтага ён неаднойчы заходзіў у рэдакцыю, і я меў вялікае задавальненне шмат пра што пагаварыць з ім. Скажу шчыра, мне рэдка даводзілася сустракаць больш цікавага субяседніка. Таразевіч быў непасрэдным удзельнікам многіх лёсаносных падзей канца 80-х — пачатку 90-х гадоў і хацеў выпусціць кнігу сваіх успамінаў. Упэўнены, гэта была б надзвычай цікавая кніга, бо Георгію Станіслававічу было пра што распавядаць людзям, і ён умеў гэта рабіць вельмі вобразна. Ды гэты намер, на жаль, не здзейсніўся — ён заўчасна зышоў з жыцця за некалькі месяцаў да сваіх 66-ці...

Але хоць кніга нашага вядомага дзяржаўнага дзеяча і не пабачыла свет, засталіся шмат якія запісы з тых размоў з Георгіем Станіслававічам. Пасля кожнай чарговай сустрэчы з Таразевічам я зноў і зноў лавіў сябе на думцы, што ён нешта не дагаварыў, што ў "загашнике" ў яго засталося яшчэ шмат чаго незвычайнага і цікавага. Што ў наступны раз мы з ім сустрэнемся і навярстаем упушчанае...

Не... Ужо не навярстаем...

Размова 1-я, студзень, 1999 год

Каштоўная наша незалежнасць

— Сённяшняе няпростае становішча нашай нацыі, многія яе праблемы сягаюць сваімі каранямі ў далёкае мінулае. Але каб паспрабаваць выявіць заканамернасці і тэндэнцыі сённяшняй нашай нацыянальнай палітыкі, давайце звернемся да некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў нашай навейшай гісторыі. Бо не сакрэт, што ў апошнія гады СССР вы якраз мелі да нацыянальнай палітыкі самае непасрэднае дачыненне. Калі ўсё ж, на вашу думку, наступіў той водападзел у гісторыі нашага нацыянальнага ўладкавання, пасля якога наш нацыянальны стан стаў, мякка кажучы, незайздросным?

— Гэта адбылося пасля Другой сусветнай вайны. З аднаго боку, менавіта тады з прычыны даволі бурных эканамічных і сацыяльных працэсаў пачалі ўкараняцца шырокім фронтам парасткі нашага сённяшняга амаль паўсюднага нацыянальнага нігілізму. З іншага боку, пачалі выяўляцца новыя тэндэнцыі ў нацыянальнай палітыцы савецкай улады. У хуткім часе пасля вайны партыяй на першы план быў выцягнуты лозунг нацыянальных кадраў. Ва ўсіх рэспубліках тады пачалі прызначаць на пасады першых сакратароў ЦК людзей карэннай нацыянальнасці. Спрабавалі зрабіць гэта адразу пасля смерці Сталіна і ў Беларусі. Першым сакратаром ЦК КПБ быў тады рускі Патолічаў. З Масквы прапанавалі Міхаіла Зімяніна, ураджэнца Беларусі. Але пленум ЦК КПБ дружна выказаўся супраць гэтай прапановы. І Патолічаў застаўся. А Зімянін вярнуўся ў Белакаменную, дзе і працаваў да пенсіі. Такі выпадак непрымання крэатуры цэнтра быў тады ў СССР адзінкавым. З усіх рэспублік толькі Мінск паўстаў тады супраць дыктату Масквы.

— Даволі своеасаблівае "паўстанне"... А як Вы ацанілі б асабістую ролю першых сакратароў ЦК КПБ у нацыянальнай палітыцы на працягу апошніх дзесяцігоддзяў нашай навейшай гісторыі? Няўжо не было сярод іх нікога, хто б шчыра хварэў бы за нацыянальныя інтарэсы беларусаў?

— Да 70-х гадоў першыя сакратары ЦК былі не больш чым рэтранслятарамі волі Масквы. Сёе-тое, канечне, рабілася, але ў канчатковым выніку істотна мяняць нацыянальную палітыку яны не маглі. Толькі ў 70-х рэспубліканскім ЦК была дадзена пэўная самастойнасць у гэтых пытаннях. Але на нацыянальны фактар ужо ніхто з кіраўніцтва Беларусі тады не арыентаваўся: падобныя праблемы сталі як бы менш актуальнымі і менш вострымі. Мяне самога тры разы выбіралі членам ЦК, і я магу з адказнасцю заявіць: нацыянальны фактар стаў тады ўжо практычна па-за ўвагай. Канечне, сёй-той з чыноўнікаў займаўся фармальна гэтым пытаннем, якое перастала быць прыярытэтным. Мы ж тады стваралі новую грамадскую фармацыю — савецкі народ...

(Працяг на 6-й стар.)

ПОЛЕМИКА

Забыл одну «мелочь»...

Хотел бы возразить подполковнику в отставке А.Курловину из Слуцка, который выступил в "Народной воле" со статьей "Пенсии разные, но и жизнь поразному складывалась". Все он подсчитал, да вот только забыл одну "мелочь". А ведь эта "мелочь" равняется пятнадцати годам. Не из-за тех ли трудностей службы военных, которые автор так скрупулезно обрисовал, офицеры уходят на пенсию в 45 лет, а мы, гражданские, в 60? Забыл А.Курлович и о несоизмеримых **реальных** зарплатах военных и гражданских, которые выше, конечно, у первых.

Михаил ГОРЕЛИК, житель г.Минска.

ДАТА

На Дзень Незалежнасці...

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы абвясцілі аб плане мерапрыемстваў з нагоды прыняцця дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі, які будзе адзначацца 27 ліпеня.

Сумесную заяўку ў Мінгарвыканкам на правядзенне мітынгу-канцэрта ад Партыі БНФ і ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі падалі Віктар Івашкевіч і Ігар Рынкевіч (адпаведна). На момант напісання гэтых радкоў ніякага адказу з ведамства Міхаіла Паўлава пакуль няма. Заяўнікі мяркуюць, што адказ павінен быць агучаны ў бліжэйшую пятніцу.

Святкаванне Дня Незалежнасці плануецца распачаць 27 ліпеня ў 16.00 ля Чырвонага касцёла. Плануецца, што тут збярэцца дэмакратычна скіраваная моладзь і дэпутаты Вярхоўнага Савета 12-га скліканння, якія і прымалі Дэкларацыю аб суверэнітэце Беларусі. "Сімвалічна, што сустрэча пройдзе побач з Домам урада — будынку, дзе і прымаўся лёсавызначальны для нашай краіны дакумент. Сімвалічна і тое, што ўдзел у сустрэчы з дэпутатамі возьме моладзь, стварыўшая і ўратаваўшая ў мінулым годзе нашу Плошчу. Гэтая сустрэча — сімвал пераемнасці пакаленняў у змаганні за незалежнасць Беларусі", — адзначыў адзін з членаў аргкамітэта па правядзенні святкавання Дня Незалежнасці палітык Павел Севярынец.

Другой падзеяй у праграме святкавання ўрачыстай даты стане ўскладанне кветак да помніка Янкі Купалы. Тут перад прысутнымі выступяць паэты і пісьменнікі.

Завяршальным акордам святкавання павінен стаць мітынг-канцэрт "Песні свабоды". На гэты момант свой удзел у ім пацвердзілі гурты "Крама", "Нейра Дзюбель" "P.L.A.N", а таксама бард Кася Камоцкая. Адметнасцю канцэрта будзе тое, што ў якасці вядучых на ім выступяць маладыя людзі, якія нарадзіліся пасля 27 ліпеня 1990 года: "Канцэрт — гэта не палітычная акцыя. Мы не выносім ніякіх палітычных патрабаванняў. Таму цалкам лагічным выглядае тое, што канцэрт будуць весці маладыя людзі, якія нарадзіліся ў незалежнай Беларусі", — паведаміў Віктар Івашкевіч.

Арганізатары не выключаюць і горшага развіцця падзей. У выпадку, калі ўлады не дадуць дазволу на правядзенне канцэрта, арганізатары будуць прапаноўваць нешта іншае: "Ад адказу, які мы атрымаем з Мінгарвыканкама будзе бачна, як улады насамрэч ставяцца да Дня Незалежнасці. Калі мы атрымаем адмову, гэта будзе азначаць, што лозунгі "За незалежную Беларусь!", а апошнім часам і "Жыве Беларусь!", які зараз актыўна выкарыстоўвае ўлада, — для яе пусты гук", — лічыць Віктар Івашкевіч.

А на наступны дзень 28 ліпеня Аб'яднаная грамадзянская партыя наладзіць чарговы футбольны турнір памяці Генадзя Карпенкі "Кубак свабоды". Удзел у ім возьмуць прадстаўнікі палітычных партый і журналісты.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ШПІЁНСКІЯ СТРАСЦІ

Па БТ распавялі пра агентурную групу

Камітэт дзяржаўнай бяспекі Беларусі агалосіў, бадай што, самы гучны шпіёнскі скандал

Па Беларускім тэлебачанні намеснік старшыні КДБ Беларусі Віктар Вегера паведаміў, што іх ведамства правяло аперацыю, падчас якой была спынена дзейнасць агентурнай групы, у склад якой уваходзіла пяць чалавек. Чацвёра грамадзян Беларусі (былы маёр Узброеных сіл Уладзімір Рускін, былы маёр, экс-начальнік службы разведкі штаба адной з зенітна-ракетных брыгад Віктар Богдан, ваеннаслужачыя радыётэхнічнай брыгады войскаў СПА Карнялюк і Пяткевіч) і маёр Узброеных сіл Расіі Юрэня, з якога, уласна кажучы, і пачалася справа.

Паведамлялася, што група з'яўлялася польскай агентурай, якую цікавіла інфармацыя, што датычылася стратэгічных аб'ектаў аб'яднанай сістэмы супрацьпаветранай абароны Беларусі і Расіі. У першую чаргу — зенітна-ракетнага комплексу С-300.

Па інфармацыі КДБ, сакрэтная дакументацыя ВПС і войскаў СПА здымалася на стужку, затым пераводзілася ў лічбавы фармат і запісвалася на флэш-карту. Для перадачы разведінфармацыі выкарыстоўваліся тайнікі, а для таго, каб пераправіць праз мяжу, быў зроблены кантэйнер унутры аўтамабільнага вогнетушыцеля.

Па тэлебачанні нават паказалі чацвярых раскаяўшыхся шпіёнаў, адзін з якіх распавёў, чаму ён стаў супрацоўнічаць з польскай разведкай. Па словах затрыманага, яго завербавалі пры спробе вывезці з Польшчы алкаголь, дапушчальная норма якога была перавышана ў пяць разоў. З двух прапанаваных яму варыянтаў — дэпартацыя на пяць гадоў плюс канфіскацыя машыны і штраф альбо праца на польскую разведку — той, па яго словах, выбраў другі варыянт.

Па словах Віктара Вегеры, справа ўжо перададзена ў суд, у адносінах усіх чацвярых узбуджана крымінальная справа па артыкуле (здрада дзяржаве ў форме шпіянажу), які прадугледжвае пакаранне на тэрмін ад 7 да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Як паведаміла газета "КоммерсантЪ" са спасылкай на памочніка дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі Івана Макушка, аперацыя беларускіх контрразведчыкаў удалася дзякуючы пільнасці ФСБ Расіі. "Наш таварыш (маёр Юрэня) прыйшоў у ФСБ, ва ўсім прызнаўся, і справа пайшла. Пачалася сумесная праца, сумеснае назіранне, і вось вам вынік", — распавёў Макушок.

Расійскае выданне дадае, што польскі МЗС на сенсацыйнае выкрыццё беларускага КДБ рэагаваць не стаў. Зрэшты, аніякіх каментарыяў з гэтай нагоды пакуль не дае і прэс-служба Пасольства Польшчы ў Беларусі. У той жа час кіраўнікоў ведамства ад адстаўкі "шпіёнскі скандал" не выратаваў.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ДЫПКУР'ЕР

Місія пасла пачалася... з хваробы

Чакаецца, што ў сярэдзіне жніўня ў Беларусь прыбудзе Часовы Паверaны ў справах Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Найджэл Гуд-Дэвіс.

Як паведамілі БелаПАН у брытанскай дыпмісіі, прыезд новага Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Вялікабрытаніі Майкла Хэдака адкладзены з-за хваробы. Плануецца, што ён прыбудзе ў Беларусь да канца гэтага года.

Н.Гуд-Дэвіс раней працаваў першым сакратаром па эканамічных пытаннях у Пасольстве Вялікабрытаніі ў Расіі.

Нагадаем, з 2003 года Пасольства Вялікабрытаніі ў Беларусі ўзначальваў Браян Бенет, які пакінуў краіну напрыканцы чэрвеня ў сувязі з заканчэннем службовых паўнамоцтваў.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Преступление без наказания

Брошюру о Козулине молодые активисты раздавали чиновникам, судьям, прокурорам

Общественная комиссия "Свободу Козулину и другим политическим заключенным" выпустила брошюру "Независимое расследование: Преступление без наказания. Юридическая экспертиза судебного дела в отношении кандидата в Президенты Республики Беларусь А.В.Козулина".

Тираж брошюры 10.000 экземпляров. В нее вошли заключения Общественной комиссии, в которых указаны факты нарушений прав А.В.Козулина как во время судебного разбирательства, так и во время его нахождения в тюрьме.

"Мы распространяли брошюру в регионах, — говорит руководитель юридической службы А.В.Козулина Олег Волчек. — В первую очередь наши активисты раздали книги местным чиновникам, судьям, прокурорам. Надеемся, что у многих поменяется мнение, что А.Козулин хулиган, как его пыталось представить Белорусское телевидение. В брошюру вошли фотографии, на которых запечатлено, как люди в черном пресекают А.Козулину проход в Национальный пресс-центр 17 февраля 2006 года, как те же люди, но только 2 марта во Дворце железнодорожников избивают А.Козулина. Опубликованы и снимки с событий 25 марта, когда солдаты направляют ружья в сторону мирных граждан.

Издание брошюры — это еще одна попытка донести правду о "деле Козулина". Ведь в Беларуси есть люди, которые даже не знают, что Александр Козулин осужден на длительный срок лишения свободы...".

Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

ІНЦЫДЭНТ

Паляванне працягваецца?

Беларускія пагранічнікі не дазволілі праехаць з Варшавы ў Маскву карэспандэнту "Gazety Wyborczej" Вацлаву Радзівіновічу. Пра гэты інцыдэнт БелаПАН паведаміў карэспандэнт выдання ў Гродне Андрэй Пачобут.

Паводле яго слоў, інцыдэнт адбыўся ноччу 16 ліпеня ў Брэсце. "Радзівіновіч з'яўляецца карэспандэнтам "Gazety Wyborczej" у Маскве, куды ён і накіроўваўся. У Брэсце прыблізна а першай гадзіне ночы беларускія пагранічнікі пасля праверкі дакументаў папрасілі яго пакінуць цягнік. Да шостай гадзіны раніцы яго трымалі на мяжы пад аховай, пасля чаго пасадзілі ў цягнік, які рухаўся назад у Польшчу", — сказаў А.Пачобут.

"Пры гэтым Радзівіновічу не паставілі ў пашпарт ніякіх адзнак, якія б забаранялі ўезд у Беларусь, — яму толькі параілі або ляцець у Маскву самалётам, або ездзіць туды цераз Украіну", — зазначыў А.Пачобут.

Раней В.Радзівіновіч працаваў карэспандэнтам "Gazety Wyborczej" у Беларусі. У верасні 2006 года ён не атрымаў акрэдытацыю беларускага МЗС і вымушаны быў пакінуць краіну.

Нагадаем таксама, што ў лютым 2006 года В.Радзівіновічу было адмоўлена ва ўездзе ў Беларусь, нягледзячы на наяўнасць усіх неабходных дакументаў. У сувязі з гэтым інцыдэнтам МЗС Польшчы накіроўвала ноту на адрас беларускага знешнепалітычнага ведамства.

Сяргей ПУЛЬША.

Народная Воля http://www.nv-online.info
19 ЛІПЕНЯ 2007 г.

ЗАКУЛИСЬЕ

Быть ли Воронецкому министром?

В минувшую субботу в столичном ресторане "Журавінка" Посольство Франции в Беларуси устроило прием по случаю своего Национального праздника. Это первый большой прием, который организовала новый Чрезвычайный и Полномочный посол Франции в Беларуси Мирей Мюссо.

И если в прошлом году мидовские чиновники проигнорировали данное мероприятие, то на этот раз на трибуне сразу появился представитель Министерства иностранных дел. Когда **Мирей Мюссо** сказала: *"Уважаемый министр, я рада видеть вас сегодня здесь"*, присутствующие стали искать в зале министра иностранных дел **Сергея Мартынова**, поскольку на трибуне рядом с послом Франции стоял его заместитель **Валерий Воронецкий**. Сотрудники МИД отреагировали на обращение посла милой улыбкой... *"Наверное, быть ему министром!"*, — слышалось в зале.

В ответ на речь посла **Валерий Воронецкий** сказал несколько обязательных дежурных фраз, передал *"пожелания мира, благополучия и процветания Франции от главы государства и правительства"* и предложил тост *"за мир, благополучие и процветание Франции, за дружбу между белорусским и французским народами"*. На этом официальная часть приема была закончена. Затем гости с удовольствием дегустировали отличный "Хеннеси", анисовый ликер "Рикарди" и настоящее бордо. Закусывали вкуснейшими французскими сырами, ветчиной и виноградом.

В "Журавінке" были замечены экс-глава Администрации президента **Урал Латыпов** с супругой, худрук Русского театра **Борис Луценко**, замминистра экономики **Андрей Тур**, председатель Госкомитета погранвойск **Игорь Рачковский** со свитой, трехкратный олимпийский чемпион **Владимир Парфенович**, экономист **Леонид Заико**, экс-министр труда **Александр Соснов** и академик Александр Войтович, который заинтересовал некоторых журналистов рассказами о личном опыте общения с представительницами прекрасной половины человечества в различных странах мира.

Пожалуй, французский прием — единственный, откуда никто не уходит без подарка. В этом году всем без исключения вручали небольшие наборы качественной французской косметики от столичного магазина "Кравт". Гостям также предлагалось воспользоваться 15-процентной скидкой на некоторые модели "Пежо".

Марина КОКТЫШ.

Мирей Мюссо и Валерий Воронецкий.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Мирей МЮССО:

«Беларусь и Франция плохо знают друг друга...»

Накануне Национального праздника посол Франции Мирей Мюссо пообщалась с журналистами. Вот некоторые выдержки из того, о чем она говорила

О национальном празднике

— 14 июля 1789 года была захвачена Бастилия — тюрьма в центре Парижа, которая на протяжении нескольких веков являлась оплотом произвола Короля, так как в ней, без всякого суда, годами содержались представители дворянства и буржуазии, писатели, — говорит Мирей Мюссо. — Однако во время июльских событий Бастилия уже не играла большой роли, так как в ней тогда находилось лишь семь заключенных, из которых четыре мошенника, два психически больных, один осужденный за инцест и ни одного узника совести. На самом деле революционеры искали там порох и амуницию. В 1790 году 14 июля состоялся праздник Федерации, ставший днем национального примирения между Революцией и Монархией, еще до того, как новые потрясения и война с Европой похоронят всякую надежду установления конституционной монархии. Именно с этими двумя историческими событиями мы связываем сегодня празднование 14 июля: с завоеванной свободой и с примирением всех французов. Именно под такой эгидой вступил в должность наш новый президент Республики Николя Саркози. Победа Саркози на выборах объясняется желанием французов завоевать новую свободу, то есть освободиться от нежелания перемен, пораженческих настроений и сомнений в прошлом. На протяжении почти тридцати лет французские правительства, а также наши партии, профсоюзы, наши учителя не решались переосмыслить собственные структуры и привычки.

О двусторонних отношениях

— 15 лет назад Франция и Беларусь установили двусторонние отношения. Однако эти две страны, которые история не так много связывала на протяжении прошедших веков, кроме кампании Наполеона, плохо знают друг друга. Хотя белорусы и знакомы с классической французской культурой, у них зачастую складывается несколько устарелое представление о нашей стране. Они не так хорошо информированы о развитии французской культуры и науки, об экономическом весе страны (Франция — пятая экономическая держава в мире) и значительной роли, которую она играет в важнейших мировых политических делах, а также в решении вопросов окружающей среды, изменения климата на планете и помощи странам "третьего мира".

Французы открыли для себя Беларусь и белорусский народ всего 3 года назад, в мае 2004 года, в момент расширения Европейского Союза. Не так много времени, чтобы у нас установились глубокие связи. Хотелось бы, чтобы французские и белорусские предприниматели устанавливали партнерские отношения, чтобы французские инвесторы поворачивались в сторону Беларуси...

Недавно Беларусь согласилась на открытие представительства Еврокомиссии. Надеемся, это поможет нам как-то более эффективно развивать наши отношения.

О торговых преференциях

— Мы знаем, что Беларусь продолжает дискуссию с Международной организацией труда, очень жаль, что она не так хорошо продвигается, как хотелось бы. Так как Беларусь является членом этой организации, она должна соблюдать взятые на себя обязательства. Отмена торговых преференций — это не какой-то каприз со стороны Европейского Союза, это следствие несоблюдения тех обязательств. Однако я оптимист и надеюсь, что проводимая дискуссия закончится положительно и что преференции для Беларуси будут восстановлены. Это в интересах Беларуси.

О строительстве АЭС

— Я знаю, что белорусские власти изучают вопрос строительства АЭС, — сказала дипломат. — Знаю, что они отправляли делегации в различные страны, в распоряжении которых есть атомные станции, и среди этих стран была Франция.

Строительство АЭС — это очень длительный процесс. Речь идет не только об овладении технических знаний, которых достаточно у белорусских специалистов. Кроме этого еще надо знать, что делать с этой станцией. Владеть вопросами безопасности, точно знать, как ее строить. Ведь технологические знания — это одно, а стройка — совсем другое. Необходимо также предусматривать подписание международных договоров по нераспространению ядерного оружия, а это длительная работа в рамках МАГАТЭ.

О туризме

— Я уже смогла посетить белорусские города, буквально пару дней назад вернулась из Мира и Несвижа и была впечатлена тем, какие реставрационные работы там ведутся. Каждый раз, когда вижу все эти работы, я высказываю свое восхищение представителям городской власти за их усилия. Это очень важно — иметь культурное наследие и связь с прошлым. Потому что народы, которые забывают о своем прошлом, часто имеют сложное будущее. Многое можно показать в Беларуси — и озера, и леса. Было бы очень хорошо, чтобы страна стала более открытой как в юридическом, так и в административном плане, чтобы у вас было меньше бюрократии, чтобы у иностранных граждан возникло меньше сомнений перед тем, как сюда поехать.

ПРАТЭСТ

А.Мілінкевіч патрабуе ад КДБ спыніць пераслед за іншадумства

Экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч накіраваў зварот да старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі РБ Сцяпана Сухарэнкі і старшыняў абласных упраўленняў КДБ з патрабаваннем спыніць пераслед за іншадумства студэнтаў, якія навучаюцца за мяжой па праграмах для рэпрэсаванай моладзі.

"У апошні час з боку супрацоўнікаў Камітэта дзяржаўнай бяспекі пашырылася практыка пераследу і ціску на навучэнцаў праграмы імя К. Каліноўскага. Супрацоўнікі камітэта запрашаюць студэнтаў-каліноўцаў на размовы на прыватных кватэрах, сустракаюць іх на чыгуначных вакзалах, калі стыпендыяты праграмы вяртаюцца ў Беларусь на вакацыі, наведваюць студэнтаў і іх бацькоў на ўласных кватэрах і па месцы працы. Нярэдка супрацоўнікі камітэта спрабуюць схіліць удзельнікаў праграмы імя К.Каліноўскага да так званага "супрацоўніцтва", — гаворыцца ў заяве лідэра дэмакратычных сіл.

Аляксандр Мілінкевіч звяртае ўвагу на тое, паводле наяўных у яго каманды шматлікіх фактаў, што супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі падчас кантактаў з навучэнцамі праграмы імя К. Каліноўскага неаднаразова выкарыстоўвалі ў сваёй працы метады, якія парушаюць пералічаныя палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

"Інфармацыя пра факты ціску на моладзь — удзельнікаў праграмы К.Каліноўскага з боку Камітэта дзяржаўнай бяспекі, а таксама пра асобы, датычныя да гэтага, з'яўляецца прадметам пільнай увагі з боку грамадзянскай супольнасці. Усім гэтым фактам будзе надавацца грамадская і міжнародная агалоска", — падкрэсліваецца ў звароце лаўрэата прэміі Еўрапейскага парламента імя Андрэя Сахарава "За Свабоду думкі".

Аляксандр Мілінкевіч заклікае супрацоўнікаў КДБ у будучым устрымацца ад практыкі палітычна матываванага пераследу грамадскіх актывістаў і спыніць ціск, запужванне і спробы вярбоўкі ў дачыненні да студэнтаў-стыпендыятаў праграмы імя К.Каліноўскага.

АТОМНЫЙ ПРОЕКТ

«Есть сомнения, выдержит ли грунт»

Площадки, выбранные под строительство АЭС, небезопасны

На площадках, предварительно выбранных для строительства атомной электростанции в Могилевской области, обнаружено залегание меловых пород, заявил на пресс-конференции в Минске начальник управления по надзору за подъемными сооружениями департамента по безопасному ведению работ в промышленности и атомной энергетике (Промatомнадзор) Министерства по чрезвычайным ситуациям Алексей Щеглов.

"На площадке, где планируется строительство АЭС, имеются залежи меловых отложений, и есть сомнения, выдержит ли грунт вес реактора", — сказал Щеглов.

По его словам, нагрузка, создаваемая реактором АЭС на грунт, составляет до 7 тонн на квадратный метр. Котлован под реактор имеет размеры 40Х60 метров и роется на глубину 17 метров, пояснил Щеглов.

По его данным, на Хмельницкой атомной электростанции (Украина) "подобная ситуация". "Меловые отложения там находятся на глубине 30 метров и уже пробурено около 11 тысяч скважин для закачки бетона, чтобы укрепить грунт, сказал Щеглов.

Он опроверг слухи о том, что строительство электростанции уже начато на Краснополянской площадке. "Строительство еще не начато. Окончательно не принято решение о площадке", — заявил начальник управления.

По его информации, начать строительство белорусской АЭС планируется в 2008 году, а окончить в 2018 году.

Щеглов сообщил, что в настоящее время рассматривается вопрос об участии в строительстве АЭС российской компании "Росатом". "Но у них много заказов на этот период, и поэтому параллельно ведутся переговоры с французской компанией", — добавил он.

По данным начальника управления, французская компания заявляет о необходимости создания в Беларуси специального органа по безопасности АЭС с подчинением его президенту страны.

Щеглов также заявил, что при выборе площадки в обязательном порядке будет учитываться наличие рядом крупного водоема. "Необходима проточная вода со скоростью тока не менее 2-х кубометров в секунду", — уточнил он.

ІНЦЫДЭНТ

Выпад супраць польскага дыпламата

Невядомыя размалявалі чорнай фарбай аўтамабіль, які належыць консулу Марціну Красінскаму — супрацоўніку Генеральнага косульства Рэспублікі Польшча ў Гродне. Нумарныя знакі і шыбы былі папсаваны надпісамі "кат" і малюнкамі непрыстойнага зместу.

Машына дыпламата знаходзілася ў мікрараёне "Дзевятоўка" каля пад'езда службовай кватэры. Па прыездзе на працу Марцін Красінскі паведаміў пра выпадак супрацоўнікам міліцыі, якія разам з прадстаўніком упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці даследавалі аўтамабіль і склалі пратакол дагляду.

АФІЦЫЙНА

Пасольства Славакіі пераехала

Пасольства Славакіі ў Мінску паведамляе пра змену свайго адраса і тэлефонных нумароў.

Дыпмісія размясцілася ў новым будынку больш высокі ўзровень бяспекі, тут больш месца. Цяпер пасольства і консульскі аддзел знаходзяцца ў адным будынку, але маюць розныя ўваходы", — паведамілі ў дыпправстаўніцтве.

Новыя тэлефоны дыпмісіі — **(017) 285-29-99, 233-97-47;** нумары факса — **(017) 233-97-57, 283-68-48.**

ГУЧНАЯ СПРАВА

Скандал у падатковай інспекцыі

Адразу сем супрацоўнікаў Інспекцыі па падатках і зборах Маскоўскага раёна Мінска апынуліся пад крымінальным пераследам.

Як падазраюць аператыўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама, здзяйсняючы рэйдавыя праверкі, падаткавікі злоўжывалі службовымі паўнамоцтвамі, складаючы фіктыўныя акты. Справа ў дачыненні да іх была распачата яшчэ 4 ліпеня, паведамляе "Ежедневник".

Галоўным падазроным па справе праходзіць начальнік аддзела аператыўна-рэйдавых праверак. Разам з ім ідзе яго намеснік, затым — галоўны дзяржаўны падатковы інспектар раёна, за ім — старэйшы і тры простых інспектары.

Пры гэтым, калі трох шараговых інспектараў аператыўнікі яшчэ паспелі затрымаць, то чатырох самых галоўных фігурантаў справы давялося аб'яўляць у вышук.

Апроч злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, падаткавікам можа быць пра-д'яўлена абвінавачванне ў атрыманні хабару. Такім чынам прадпрымальнікі адкупляліся ад адказнасці за выяўленыя парушэнні.

Германия заинтересована в трудоустройстве тех, кому за пятьдесят

В Германии с 2012-го по 2029 год решено постепенно увеличить возраст выхода на пенсию с 65 до 67 лет. Теперь усилия министерства труда Германии сконцентрированы на том, чтобы стимулировать работодателей и профсоюзы следить за тем, чтобы коллективные соглашения о зарплате сделали возможным распределение рабочих мест среди людей старшей возрастной категории. В частности, работодатели будут получать государственные субсидии, если они нанимают рабочих в возрасте 50-60 лет. Фактически, люди старше 50 лет в Германии перестают вытесняться с рынка труда.

Сохранение достойной пенсии — социальная стратегия

Увеличение пенсионного возраста — один из многих шагов, сделанных в Германии для того, чтобы предотвратить финансовые затруднения, которые угрожают спадом в экономике, если только демографическая ситуация не улучшится. К 2035 году доля тех, кому больше 65 в Германии может составить 30% населения, в то время как сейчас она — 18%.

Что примечательно, в Беларуси доля пенсионеров уже 26%, при этом трудоустроиться человеку старше 50 очень сложно. И положительный опыт Германии в стимулировании трудоустройства тех, кому за пятьдесят, должен быть полезен.

Система государственного пенсионного обеспечения в Германии построена, как и у нас, на принципе так называемой "солидарности поколений". То есть работающее население финансирует основную часть пенсии своих родителей, чтобы потом получать пенсию за счет отчислений уже своих детей. Соответственно, чем больше будут трудиться родители, тем меньше будет нагрузка на детей, что позволит сохранять пенсионные выплаты на должном уровне. При этом планируется, что размер взносов (пенсионных отчислений) работающих лиц до 2020 года не должен превышать 20 процентов, а до 2030 года — 22 процентов от зарплаты.

В настоящий момент уровень пенсий составляет в ФРГ приблизительно 70 процентов. То есть по завершении карьеры человек получает в среднем 70 процентов от своего прежнего дохода.

Кроме того, в Германии традиционно ориентируются на дополнительные источники пенсионного обеспечения — профессиональные (корпоративные) пенсии и выплаты по договорам страхования жизни. Эти "дополнительные" пенсии дают возможность нивелировать разницу между прежним заработком и пенсией.

Пенсии, о которых думаешь сам

Работодатель самостоятельно создает накопительный фонд для своих сотрудников либо заключает договор с организацией, предоставляющей подобные услуги. Сами сотрудники тоже могут участвовать в дополнительном финансировании своей пенсии. Важным условием корпоративного страхования в ФРГ является обеспечение сохранности вкладов сотрудников в случае банкротства компании.

В "частных" программах дополнительного пенсионного страхования участвуют представители почти всех слоев населения. При данном виде страхования сумма отчислений не находится в прямой зависимости от уровня доходов.

Какие варианты здесь имеются? Основной — это так называемое страхование жизни. Его суть: работающий осуществляет в течение определенного промежутка времени отчисления, которые по окончании срока действия страховки (чаще всего — наступления пенсионного возраста) выплачиваются вместе с процентами. В случае смерти застрахованного деньги получают его наследники. У страхования жизни есть несколько видов — например, капитальное страхование жизни или фондовое страхование жизни. В этих случаях внесенные средства инвестируются в фонды или акции с целью получения максимальной прибыли, что тоже в итоге влияет на конечный размер выплат.

Данная публикация подготовлена при содействии Европейского Союза и не обязательно отражает официальную точку зрения ЕС. За дополнительной информацией обращайтесь на сайт www.delblr.ec.europa.eu

СІТУАЦЫЯ

Увага! Таго, хто знайшоў пісталет, просяць вярнуць зброю ўладальніку

Віцебскія міліцыянеры не паведамляюць, дзе і пры якіх абставінах яны згубілі службовую зброю. Але добрасумленнаму грамадзяніну, які выпадкова знойдзе пісталет і аднясе яго ў аддзяленне міліцыі, яны абяцаюць узнагароду у памеры 2 мільёнаў рублёў.

Віцебская міліцыя нават дала аб'явы ў мясцовыя сродкі масавай інфармацыі. Асаблівыя прыкметы згубленай зброі: пісталет Макарава за нумарам "ИЕ 3776 К".

ЧУЛІ?

А ім — да лямпачкі...

У мэтах выканання дырэктывы прэзідэнта аб эканоміі і ашчаднасці дэпутаты прапануюць замяніць усе свяцільні ў Палаце прадстаўнікоў на энергазберагальныя. "Такія рэчы, нягледзячы на тое, што гэта кропля ў моры, неабходна зрабіць у нашым будынку пачынаючы з Авальнай залы і заканчваючы ўсімі працоўнымі кабінетамі", — заявіў старшыня пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД **Вадзім ПАПОЎ**.

Народная Воля http://www.nv-online.info
19 ЛІПЕНЯ 2007 г.

КАНФЛІКТ

«Просім праверыць законнасць...»

Рабочыя ААТ "Мінскі падшыпнікавы завод" звярнуліся з калектыўным лістом у Адміністрацыю прэзідэнта і Камітэт дзяржаўнага кантролю з просьбай правесці праверку на прадпрыемстве.

Рабочыя ў сваім звароце выказваюць занепакоенасць фінансавым і эканамічным станам прадпрыемства і абвінавачваюць кіраўніцтва завода ў непрафесійным кіраванні і нерацыянальным выкарыстанні крэдытаў. Так, у лісце яны паведамляюць, што дырэкцыя прадпрыемства набыла аўтамабіль прадстаўнічага класа, спецыяльную форму для ахоўнікаў, устанавіла новае абсталяванне на прахадной. Разам з тым будынкі цэхаў настолькі зношаныя, што падчас дажджоў рабочыя робяць плёначныя пакрыцці над станкамі. У лісце прыводзяцца факты, калі адміністрацыя не забяспечыла работнікаў дапаможнымі вытворчымі матэрыяламі, спецадзеннем, спецабуткам, спецхарчаваннем, інструментам. Работнікі скардзяцца на нізкую заработную плату на фоне росту персанальных надбавак кіраўнікам.

Рабочыя прадпрыемства заяўляюць, што, калі ў бліжэйшы час сітуацыя не зменіцца, яны ў знак пратэсту выйдуць на вуліцы горада або перакрыюць рух на адной з вуліц сталіцы, як гэта раней зрабілі рабочыя Мінскага мотавелазавода.

У дырэкцыі прадпрыемства БелаПАН адмовіліся пракаментаваць сітуацыю.

Нагадаем, былое кіраўніцтва Мінскага падшыпнікавага завода было арыштавана і прыгаворана судом да пазбаўлення волі. Прыгаворам суда Заводскага раёна сталіцы 14 сакавіка 2006 года гендырэктар прадпрыемства быў асуджаны па ч.3 арт.424 (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі) і арт.240 (наўмыснае банкрутства) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь на шэсць гадоў пазбаўлення волі; дырэктар па маркетынгу і начальнік фінансавага аддзела — па ч.3 арт.424 і арт.240 КК на тры гады шэсць месяцаў пазбаўлення волі; намеснік дырэктара па эканамічных пытаннях — па ч.3 арт.425 (бяздзеянне службовай асобы) на тры гады шэсць месяцаў абмежавання волі. Таксама ў канцы студзеня 2006 года быў арыштаваны за хабарніцтва намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай працы.

У 2006—2007 гадах у адпаведнасці з указам прэзідэнта на прадпрыемстве праводзіцца рэструктурызацыя даўгоў перад рэспубліканскім бюджэтам і па плацяжах за энерганосьбіты, а таксама прадастаўлена субсідыя з дзяржбюджэту ў памеры 16,6 млрд рублёў.

Марына НОСАВА.

ИЗ ЗАЛА СУДА

Профанация,

или Как судили моего внука

На российском телевидении есть передача "Суд идет". С точки зрения правового воспитания это замечательная программа. Прямо в студии, на глазах миллионов зрителей, рассматриваются вопросы, относящиеся ко всем кодексам.

Многие из вас, уважаемые читатели, наверняка обращали внимание на то, что в российском телесуде нет стальной клетки, в которую без опаски можно было бы поместить льва.

В Беларуси в подобных клетках сидят те, кого судят и за бандитизм, и за "колоски". Всех, кого доставляют в суд из следственного изолятора. Российский обвиняемый в убийстве находится (на телеэкране) рядом с адвокатом, за одним столом. Охранник в двух шагах за спиной. Стоит, не чиня обвиняемому препятствий в общении с адвокатом во время процесса и лицами, находящимися в зале суда, в перерывах.

Сидящий в клетке белорусский обвиняемый видит только спину адвоката. Проконсультироваться с защитником во время судебного заседания он не в состоянии. Что же касается разговоров обвиняемого с другими лицами (до начала процесса, в перерывах между заседаниями), то наумовские стражники оказываются свирепее Цербера, стерегущего двери ада.

В звериной клетке судили недавно и моего внука. Как серийного маньяка или террориста Аль-Кайеды, несовершеннолетнего Антона доставляли до самой клетки в наручниках.

Более того, подростка (ему нет еще 18 лет) в здании суда лишили обеда! И судья, и прокурор, и охранники отобедали, а обвиняемому — "фигу с маслом". Не только не накормили, но и не позволили родителям сделать это.

Наумовская инструкция, видите ли, запрещает тому, кто в клетке, общаться даже с родственниками, не говоря уже о друзьях-товарищах. Однако в здании суда ни самой инструкции, ни хотя бы выписки из нее не видно. Да и в зале судебных заседаний зоопарковская надпись "Кормить находящихся в клетке запрещено!" отсутствует.

Уголовный кодекс предоставляет равные права государственному обвинителю и обвиняемому. В дополнение к этому статья 331 УК гласит, что обвиняемый может пользоваться письменными заметками.

Вот только как эти самые заметки делать? Поскольку звери не пишут, то и стола в клетке не предусмотрено. Ручки, бумаги — тоже. Передавать же пишущие принадлежности наумовские стражники запрещают.

* * *

Требование УПК об обязательном участии педагога в судебном процессе над несовершеннолетними вылилось в опошление сущности защиты прав подростка. Педагог, присутствующий в зале суда, обвиняемого Антона видела первый раз в жизни. Понятия не имела ни о жизни, ни об учебе этого юноши, ни об инкриминируемом ему преступлении. За время процесса не проронила ни слова: сидела, простите, как истукан. Не подошла ни к Антону, ни к его родителям.

Даже начало судебного процесса из-за неявки социального педагога задержали на час. Только утром отловили первого попавшегося "шкраба" (школьного работника) с 10-месячным (как она заявила суду) стажем работы. Естественно, с материалами дела педагог этот скорее всего не знакомилась. Непонятно, имеет ли она хотя бы малейшее понятие о судебных процедурах.

Но для протокола формальность соблюдена.

Формально выполнено и требование УПК о коллегиальном рассмотрении дела в отношении подростка в составе судьи и двух народных заседателей. Непонятно, правда, почему заседателей именуют "народными", коли к их появлению в судейских креслах народ отношения не имеет.

Одна "народная" сладко спала (благо хоть не храпела), вторая — отрешенно кивала головой при обращении судьи. Сами "народные" заседатели-бабушки интереса к процессу не проявили. Участникам процесса не задали ни одного вопроса.

Зато по протоколу все в ажуре.

Уголовно-процессуальный кодекс предусматривает несовершеннолетним обвиняемым обязательное участие защитника. Формальность соблюли: адвоката внуку назначили.

Но это — профанация юридической защиты. Не знаю, знакомилась ли сей юрист с материалами дела, но перед началом процесса ни словом не перемолвилась как с обвиняемым, которого обязана защищать, так и с его матерью, представителем несовершеннолетнего. Не задала ни одного вопроса участникам процесса, в том числе и своему подзащитному. Полутораминутная адвокатская речь в прениях заключалась в обращении к суду с просьбой о назначении минимального наказания. После провозглашения приговора адвокат покинула зал суда даже не обернувшись к несовершеннолетнему парню, которого защищала. А проходя мимо родителей теперь уже осужденного ребенка, отвернулась в другую сторону...

Читатели, знающие меня, наверняка возмутятся: автор-то юридически подкован, а УПК дает право близким родственникам (к которым относится и дед) участвовать в судебном процессе в качестве защитника.

Так-то оно так. Только на следующем листе Кодекса (п.2 ч.5 статьи 46) записано: близкие родственники в подтверждение своих полномочий предоставляют суду документы о родственных отношениях с обвиняемым.

Председательствующая на процессе судит моего внука не впервые. О юридической грамотности деда обвиняемого осведомлена. Именно поэтому на предыдущем процессе (явно с целью противодействия получению внуком квалифицированной правовой помощи) после заявления Антоном ходатайства о допуске к участию в деле дедушки (отец как законный представитель ходатайство поддержал), ехидно улыбаясь, затребовала документальное подтверждение степени родства.

Судья Н.Кузнецова прекрасно знала, что это ее законное требование на тот момент невыполнимо. В паспорта вносят только несовершеннолетних детей. По данному основанию в моем удостоверении личности дети, которым за сорок, не вписаны. Соответственно сведения о родителях не заносят в паспорта детей. А уж внуки в паспорте деда и теоретически не могут значиться.

Подтвердить документально родство даже при одинаковости фамилии непросто. Что тогда говорить про внуков от дочери, у которых и фамилия другая, и отчество с именем деда никоим образом не связано?..

* * *

Довольная Кузнецова и в прошлый раз, и на этот судила моего внука фактически без защитника. Назвать защитниками угрюмо молчавшую адвокатшу и, смею сказать, ни бельмеса не понимающего в юриспруденции педагога — язык не поворачивается. Но, похоже, такое положение с правовой защитой несовершеннолетних обвиняемых суд Московского района очень даже устраивает.

Устраивает, поскольку судебного следствия судья не проводила. Не изучены вещественные или документальные подтверждения предъявленного обвинения, не прозвучали показания свидетелей. Доказательство основывалось лишь на признательных показаниях подсудимого — на показаниях ребенка, на которого "навесили" кучу не раскрытых в районе преступлений и более полугода обрабатывали в следственном изоляторе.

Похоже, в Беларуси реанимирован античеловеческий принцип сталинского прокурора Вышинского: "Признание — царица доказательств".

На самом деле никто не знает, что сегодня происходит. Это отчасти вызвано тем, что наследие ушедшего из жизни президента по-прежнему очень сильно. Туркменистаном все еще правит страх. Здесь произнесенное вслух имя президента заставляет людей вздрагивать, шептаться и замолкать.

Те немногочисленные аналитики, которые наблюдают за Туркменистаном, говорят, что им не известно, прочно ли Бердымухаммедов удерживает власть или лишь отчаянно хватается за нее. Они не в состоянии определить его внутренний круг приближенных, описать процесс принятия решений, не говоря уже о планах президента или о его способности их реализовывать.

Вот что сказал один европейский дипломат, описывая свои контакты с туркменскими представителями власти: "Они боятся говорить во время встреч, так как знают, что все прослушивается".

В такой неопределенности каждый видит знаки. Некоторые из них обнадеживают, другие не очень. Беседы с двумя десятками туркмен, с представителями Запада, дипломатами и ведущими бизнесменами дают противоречивые представления.

Один человек средних лет говорит, что Ниязов не заботился о выплате зарплат. Теперь работникам государственных коллективных хозяйств деньги выплачивают вовремя. "Они жили как рабы, — говорит он, — теперь стало лучше".

Некоторые туркмены отмечают, что при всей репрессивности государства оно во многом отличается от безобразия и неразберихи советских времен. Рынки заполнены азиатскими товарами; страна избежала терроризма, войны и религиозного экстремизма, характерных для ее соседей. Электричество и отопление бесплатные, продукты питания дешевы, а бензин продается с большими скидками. "Мы не свободны, — пожимает плечами один человек, — но мы и не голодны".

Ниязов ограничил народное образование девятым классом и заставил учеников учить "Рухнаму" — двухтомник, наполовину состоящий из автобиографических стихов и банальных сентенций, принадлежащий его перу. Он заявил, что книга эта очистит нацию. После себя Ниязов оставил целое поколение полуграмотных туркмен.

Отрывок из "Рухнамы".

Бердымухаммедов, по образованию зубной врач и способный чиновник, вновь ввел 10-летнее образование. Он говорит, что будут проведены дополнительные реформы в сфере просвещения. Пока непонятно, есть ли у него желание и сила воли, чтобы отменить "Рухнаму", знания которой проверяют во время экзаменов при поступлении на государственную службу.

Некоторые действия нового президента несут на себе налет эгоцентричной любви его предшественника к власти. Ниязов без конца проводил чистки в рядах высокопоставленных чиновников, держа государственную власть в страхе и в подвешенном состоянии. Его сменщик берет с него пример. В апреле он прямо в телеэфире уволил с должности высокопоставленного руководителя из правоохранительных органов. "У меня целая папка изобличающих тебя документов, — сказал он, — я могу обесчестить тебя как собаку".

Обещание президента обеспечить всеобщий доступ к Интернету вылилось в итоге в создание небольшой горстки государственных Интернет-кафе. Когда один журналист зашел в такое кафе, он увидел пять компьютеров, но ни одного посетителя. Чтобы побродить по Интернету, надо заплатить почти 4 доллара за час. Это огромная сумма для страны, где зарплата часто меньше 65 долларов в месяц. Более того, прекращен доступ к немногочисленным материалам на русском языке, в которых звучит критика в адрес правительства. А когда тот журналист сел за компьютер, в течение 15 минут в кафе прибыл полицейский и сел рядом с ним.

Проблемы существуют и в других областях. Бердымухаммедов стремится получить иностранные инвестиции, однако условия для бизнеса ужасные. Один западный бизнесмен рассказал, что в его офисе просто кишат информаторы из туркменской службы безопасности. Банковские счета замораживают без возможности возврата денег. Договоры аренды жилья без долгих рассуждений аннулируют, а жильцов выселяют. В одном из случаев жильца выгнали через день после того, как он внес арендную плату за полгода вперед.

"Здесь не будет никаких серьезных инвесторов, потому что никто не знает, что может случиться с инвестициями", — говорит вышеупомянутый бизнесмен. Тем не менее обитатели гостиниц отмечают, что там практически вдвое увеличилось количество проживающих, поскольку авантюристы и спекулянты стремятся закрепиться в таких отраслях, как нефте- и газодобыча, строительство, а также в тех секторах, которые в плановой экономике Ниязова оказались слаборазвитыми.

Нет никакого публичного обсуждения проблем страны и действий правительства, потому что независимая пресса отсутствует. Все содержание сводок новостей в Туркменистане контролируется из кабинетов президентской администрации. "Они никогда не говорят правду, — сообщает одна молодая женщина, — все хорошо, все хорошо, все хорошо".

Бердымухаммедов говорит об иностранных инвестициях. Но что касается власти и прав человека, здесь он проявляет меньше готовности к переменам. Когда журнал "Туркменистан" задал ему вопрос о демократизации, президент не проявил спешки. "С детства я помню фразу отца, — сказал он. — Тот говорил: "Никогда не беги туда, куда ты можешь просто дойти".

КАК РАБОТАЮТ ПРЕЗИДЕНТЫ

Обед с интеллектуалами

На днях в Елисейском дворце обедали пятеро интеллектуалов: член Французской академии Элен Каррер д'Энкосс, философ Андре Глюксманн, историк Макс Галло, кинематографист Клод Ланзманн и эссеист и профессор литературы в университете Париж-7 Эрик Марти.

Они говорили о России, университете, открытости, деле Clearstream, предвыборной кампании, Международном валютном фонде, публикации специального номера бывшего журнала Жана-Поля Сартра Temps modernes, посвященного Альберу Камю, столетии Клода Леви-Стросса, которое хочет торжественно отметить Елисейский дворец. Глава государства Саркози предоставлял слово гостям, слушал, интересуясь их мнением о его кампании и первых неделях президентства.

В связи с этим обедом СМИ замечают: Саркози знает, чего ему не хватает. У его предшественников было преимущество перед этой элитой, которым он не обладает: Помпиду издал антологию французской поэзии и имел жену — специалиста по авангарду, Жискар мог упомянуть Мопассана на телевидении, Миттеран говорил с Жаном Гиттоном о смерти. Даже Ширак, скрывавший за репутацией грубияна страсть к примитивному искусству, умел соблазнить историков искусства и этнологов.

А Саркози? Несколько упоминаний Селина и Альберта Коэна, посещение выставки скульптора Ансельма Кифера и тут же любовь к эстраде и популярному телевидению... Участник обеда Эрик Марти, впервые открывший для себя Саркози, отважился на следующее заключение: "Есть в нем какое-то коммуникационное либидо".

Сергей ИВАНОВ.

СЛЫШАЛИ?

США купили у России туалет

Национальное аэрокосмическое агентство США (NASA) заказало в России туалет для американской части МКС за 19 миллионов долларов, передает "Ассошиэйтед Пресс". Как заявили представители агентства, создание собственного устройства обошлось бы дороже.

Освоить пользование новым туалетом астронавтам будет несложно: он несущественно отличается от того, что установлен на станции в настоящее время. Новая модель, которую привезут на МКС к 2008 году, будет обеспечивать переработку мочи в питьевую воду.

Туалет для МКС похож на земные, но дополнительно оснащен фиксаторами для ног. Специальный вентилятор засасывает отходы в предназначенную для них емкость. Астронавты станции переносят резервуары с мочой на грузовые корабли, которые сгорают в земной атмосфере при отстыковке.

Данный заказ является частью крупного контракта, заключенного между NASA и РКК "Энергия". Соглашение на сумму 46 миллионов долларов включает поставку программных обновлений для системы управления на МКС, запасного насоса, а также инженерно-техническую поддержку работы механизма, обеспечивающего стыковку шаттлов со станцией.

БЫВАЕТ И ТАКОЕ

За неделю трижды попал в больницу и один раз в тюрьму

Житель американского штата Теннесси 42-летний Тони Хикс за одну неделю трижды попал в больницу и один раз в тюрьму.

Сначала Хикс угодил под машину, что стало поводом для первого из трех визитов в местную больницу. На следующий день в квартиру Хикса проник вооруженный ножом злоумышленник. Он ударил хозяина квартиры кружкой по лицу, а затем вынес из квартиры ценные вещи. Неудачливому американцу вновь пришлось наведаться в госпиталь.

Потом сотрудница небольшого магазина недалеко от дома Хикса сообщила в полицию о том, что в помещение зашел человек в белой бандане, закрывавшей лицо, ударил ее и, угрожая пистолетом, потребовал открыть кассу и отдать ему выручку.

В ходе расследования этого ограбления был допрошен и Хикс. Как сообщается в рапорте полицейских, во время допроса он "повел себя агрессивно" по отношению к офицерам, те были вынуждены применить оружие, в результате мужчина был ранен, а затем арестован.

Суд отклонил иск к Богу

Суд румынского города Тимишоара отклонил иск 40-летнего Мирчи Павела к Богу. Судьи пришли к заключению, что Бог не является субъектом права и к тому же не имеет адреса проживания, передает агентство AFP.

Мирчи Павел, который отбывает 20-летний срок заключения за убийство, требовал привлечь "именуемого Бога, проживающего на небесах и представленного на земле Православной церковью", к ответу, обвинив Его в "мошенничестве, злоупотреблении доверием, коррупции и торговле влиянием".

По словам истца, при крещении он заключил с обвиняемым договор, в котором тот обязался избавить его от бед. Однако Бог до сих пор не выполнил ни одного из взятых на себя обязательств, несмотря на многочисленные подношения и молитвы, с которыми к нему обращался Мирчи Павел.

Загрыз собаку

Китайский крестьянин до смерти искусал свирепую собаку, чтобы защитить от нее своего любимого щенка, передает ИТАР-ТАСС со ссылкой на местные СМИ.

Необычный инцидент произошел в китайской провинции Хэбэй. Фермер Гэн проснулся ночью от тревожного лая во дворе.

Выйдя из дома, он видел, что чужая большая собака пытается атаковать его щенка. Пытаясь дать отпор, крестьянин принялся кидать в собаку попавшиеся под руку арбузы.

Однако злой пес не унимался и пытался наброситься на щенка и его хозяина. Тогда Гэн бросился врукопашную на агрессивное животное, мертвой хваткой впился зубами в ее горло, пока не загрыз собаку до смерти.

Судебную ошибку исправили через 22 года

Суд в США снял обвинение с человека, отсидевшего в тюрьме 22 года, передает РИА "Новости". Бирон Хэлси был приговорен за изнасилование и убийство двух детей семи и восьми лет.

Его невиновность удалось доказать с помощью самого современного научного исследования ДНК. Оно позволило выяснить, что потрясшее своей жестокостью убийство совершил сосед Хэлси, который находится в заключении уже 17 лет за преступления на сексуальной почве. 20 лет назад подобные тесты в США еще не проводились.

Примечательно, что Хэлси, которому сейчас 46 лет, признался в злодеянии. Как выяснилось теперь, он сделал это после почти непрерывного 30-часового допроса.

Хэлси грозил электрический стул, однако суд присяжных выбрал для него "мягкий" приговор — два пожизненных заключения плюс 20 лет тюрьмы. Только благодаря этому мужчина получил шанс вернуться на свободу.

А-ля ГДР

Теперь в Берлине, кроме музея ГДР, можно освежить память или впервые познакомиться с атмосферой, царившей в ГДР, в новой молодежной гостинице а-ля ГДР — Ostel. Ее название образовано из двух слов: "Ost" — восток и "Hostel" — гостиница, предоставляющая на короткий срок жилье путешественникам.

"Прошлое мы использовали, чтобы сотворить что-то новое, уникальное, выделяющееся на фоне уже существующего в Берлине", — рассказал один из владельцев гостиницы в интервью интернет-изданию tagesschau.de.

Снаружи здание полностью обновлено. Фойе гостиницы украшают оригинальные обои 70-х годов, тяжелые темно-коричневые диваны и красные гвоздики. Стиль здесь можно обнаружить во всем — начиная от оригинальных аксессуаров, мебели и обоев и заканчивая коктейль-баром, не совсем вписывающимся в ретро-атмосферу.

Во многих номерах над кроватью висит портрет Эриха Хонеккера, бывшего председателя Социалистической единой партии Германии (СЕПГ) и госсовета ГДР. Многие гости не понимают этой шутки и прячут картину подальше в шкаф.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
19 ЛІПЕНЯ 2007 г.

ПАМЯЦЬ

Недапісаная кніга Георгія Таразевіча

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

— А з Масквы былі якія-небудзь дырэктывы па нацыянальным пытанні?

— Не. Нацыянальную і кадравую палітыку, як я казаў вышэй, з 70-х вызначала Бюро ЦК. Толькі першых сакратароў ЦК прызначала Масква, там жа зацвярджалі і сакратароў абкамаў. А сакратароў гаркамаў, райкамаў прызначаў Мінск. Праўда, калі мяне рэкамендавалі першым сакратаром Мінскага гаркама, ездзіў я ў Маскву на гутарку ў ЦК КПСС. Гэтая пасада была на ўзроўні абкама.

— Аб чым, калі не сакрэт, з Вамі "гутарылі"?

— Якраз нацыянальныя праблемы і не абмяркоўваліся. Размова ішла выключна аб рабоце партыйнага апарата.

— Неяк Мікіта Хрушчоў, наведаўшы Мінск, пахваліў беларусаў за іх ідавочныя поспехі ў справе "дэнацыяналізацыі". Як рэагавала на гэты факт наша партыйная эліта?

— Тыя выказванні нікім з нашага кіраўніцтва не дубліраваліся і не каментаваліся.

— Але некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што дэбеларусізацыя ў нас была перманентнай і ніколі не спынялася, што яна была партыйнай і дзяржаўнай палітыкай...

— Калі гаварыць пра нацыянальную культуру і асабліва пра мову, то найбольшую шкоду нанеслі ім, на мой погляд, усё ж не "інтрыгі" ЦК КПБ, а перш за ўсё вельмі бурная пасля вайны урбанізацыя дзяржавы, выкліканая яе прамысловым развіццём. Калі ў Беларусі пачаўся бурны прамысловы пад'ём, прыехала шмат спецыялістаў з Расіі і іншых рэспублік. Рабочай мовай грандыёзных будоўляў была руская мова, на кіруючых пасадах было шмат, як цяпер кажуць, рускамоўных. А беларусы заўсёды вызначаліся ўменнем прыстасоўвацца да абставін і начальства.

— Дзесьці з сярэдзіны 60-х пачаўся перавод пераважнай большасці навучальных устаноў краіны — ВНУ, тэхнікумаў — на рускую мову. Ці былі нейкія дырэктывы партыйных органаў на гэты конт?

— Ніякіх спецыяльных дырэктыў, каб пераводзіць навучальныя ўстановы на рускую мову выкладання, не было. Усё адбывалася, думаю, больш празаічна і спантанна. Многія з кіраўнікоў людзі прыезджыя, ніяк не маглі зразумець практычную неабходнасць у "сапсаванай рускай мове".

— Адносна чужых такую палітыку яшчэ неяк можна зразумець, хаця гэта і сведчыць пра ўзровень іх культуры і адукаванасці. Але добра вядома, што найбольш апантанымі далакопамі "беларушчыны" былі свае, тутэйшыя.

— І такіх хапала. Але я хачу яшчэ раз адзначыць: меркаванні адносна мовы не былі ідэалагічнымі ці палітычнымі, а перш за ўсё прагматычнымі. Іншая справа, што ўсё гэта паступова стала атаясамлівацца.

— Вы хочаце сказаць, што кіраўнікі Беларусі, тыя ж Мазураў, Машэраў, Слюнькоў, свядома не праводзілі антынацыянальную палітыку?

— Прынамсі нейкай спецыяльнай змовы кіраўніцтва рэспублікі па ліквідацыі беларускай культуры і мовы ніколі не было. Усё было працей — многія адмаўляліся ад свайго не з-за нечых загадаў, інструкцый і дырэктыў, а найперш таму, што не бачылі для гэтага якіх-небудзь практычных перспектыў.

— Шмат у свой час пісалі пра тое, што пэўныя органы заўсёды трымалі пад сваёй пільнай увагай жыццё творчай эліты, умела "падзялялі і кіравалі". Сцвярджалася, што практычна ўся наша нацыянальна зарыентаваная інтэлігенцыя была пад каўпаком, бо амаль на кожнага быў нейкі кампрамат, якому пры неабходнасці давалі ход. Вам як высокаму партфункцыянеру траплялі ў рукі такія матэрыялы?

— А як жа? Але гэта, як правіла, былі ананімныя даносы. І такой інфармацыі пра якія-небудзь нелаяльныя да ўлад выказванні пісьменнікаў я ніколі не даваў ходу. Прачытаю — і парву, бо многія з тых выказванняў гаварылі хутчэй пра эмацыянальнае становішча чалавека, а не пра сутнасць яго светапогляду.

— Як Вы ацэньваеце дзейнасць Мікалая Слюнькова, з якім немалы час працавалі поруч?

— Слюнькоў быў чалавекам з дыктатарскімі схільнасцямі і, па сутнасці, тэхнакратам. Ён тыповы гаспадарнік, мала цікавіўся пытаннямі ідэалогіі. Ідэалагічныя пытанні вырашалі іншыя функцыянеры.

— Накшталт Кузьміна?

— Аляксандра Трыфанавіча Слюнькоў потым змясціў. Кузьмін, чалавек разумны, быў талковым кіраўніком. Ён, можа, не вельмі ўмеў публічна выступаць, але ідэолагам быў добрым.

— У апошнія гады савецкай улады назіралася пэўнае зніжэнне ўзроўню нашых кіруючых кадраў? Што, знізіўся ўзровень іх селекцыі? Ці, можа, забыліся на запавет таварыша Сталіна, што кадры вырашаюць усё?

— Селекцыя, канечне, была. Але, відаць, змяніліся з часоў Сталіна крытэрыі. У кіруючых структурах яркіх выбітных асоб было тады няшмат. Пасля Кузьміна на ідэалогію прыйшоў Пячэннікаў — і пачаўся яе крах. У апошнія гады савецкай улады галоўнай нашай бядой было тое, што кіравалі не гуманітарыі, а тэхнакраты. Пасля Слюнькова, які не быў таленавітым палітыкам, але добра вялодаў пытаннямі эканомікі (палітык, лічу, павінен быць гуманітарыем!), прыйшоў Сакалоў, які, на мой погляд, не адпавядаў гэтай пасадзе.

— Як жа ўсё ж стаў "ля руля" такога ўзроўню чалавек якраз напярэдадні найважнейшых падзей у нашай гісторыі?

— Я глыбока перакананы, што прызначэнне ў 1988 годзе на пасаду Першага сакратара ЦК КПБ Сакалова ў значнай ступені паўплывала не толькі на тагачасныя падзеі. Яно было, бясспрэчна, вызначальным у далейшым лёсе Беларусі — ва ўсялякім разе на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Калі на пленуме ЦК КПСС Слюнькоў быў выбраны сакратаром ЦК КПСС, ён сабраў нас (пяць ці шэсць членаў Бюро ЦК КПБ, што былі ў Маскве на пленуме) у гатэлі і пачалося абмеркаванне, каго рэкамендаваць замест яго на пасаду Першага сакратара ЦК КПБ. Абмяркоўвалі некалькі кандыдатур.

— Калі не сакрэт, якія? Ці была там кандыдатура Таразевіча?

— На гэтае пытанне я адказваць не буду...

— Зразумела... А Сакалоў быў у іх ліку?

— Быў, але супраць яго катэгарычна запярэчыў Хусаінаў, першы намеснік старшыні Саўміна і член Бюро ЦК. І было прынята пэўнае рашэнне. Але пасля вяртання ў Мінск у першы ж дзень работы Слюнькоў запрасіў да сябе мяне і Кавалёва, тагачаснага старшыню Саўміна. "Мы вырашылі адно, — сказаў ён нам, — а будзе па-іншаму. Першым будзе выбраны Сакалоў". Што і як, Слюнькоў нам тады не распавядаў, але, я думаю, што ў справу ўмяшаўся даўні сябра Сакалова — член Палітбюро ЦК КПСС Лігачоў.

Калі б на чале Беларусі падчас радыкальных гістарычных перамен быў нацыянальна арыентаваны кіраўнік (накшталт Бразаўскаса ў Літве), то нашае з вамі сённяшняе жыццё было б зусім іншым...

— Вы ўсё ж, напэўна, маеце на ўвазе Таразевіча, які зусім інакш ставіўся да нацыянальнага пытання?

— Справа не ў Таразевічы канкрэтна, а ў агульнай тэндэнцыі. Тут мог быць усялякі чалавек, які добра разбіраецца ў рэаліях грамадскага жыцця, здольны адэкватна рэагаваць на праблемы. Той жа Бразаўскас прыйшоў і пайшоў, але справу сваю зрабіў. Без узрушэнняў і вялікіх канфліктаў. Цяпер ясна, што працаваў ён перш за ўсё дзеля карысці сваёй нацыі, свайго народа. Ды, зрэшты, не толькі Бразаўскас. Возьмем Польшчу — там нават камуністы прызналі прыярытэтнымі нацыянальныя каштоўнасці, разумеючы іх велізарную значнасць.

— Але ж Ваш асабісты лёс тады, у канцы 80-х, складаўся быццам бы паспяхова. Вас выбралі народным дэпутатам СССР, а потым старшынёй Камісіі па нацыянальных пытаннях Вярхоўнага Савета СССР.

— Калі казаць сумленна, то мяне ў Маскву папросту выштурхнулі. Сакалоў не змог са мной супрацоўнічаць, бо ведаў маё да яго стаўленне. Пасля мяне старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР стаў Мікалай Дземянцей. Ён быў з той жа кагорты, якая не была здольная арыентавацца ў рэзка змяніўшыхся рэаліях. Гэта было бядой для нашага народа: на пераломным этапе яго гісторыі да ўлады ў Беларусі прыйшлі людзі, якія не змаглі стваральна паўплываць на сітуацыю.

— І мы сёння пажынаем плады іх памылак?

— Думаю, так. Што ж датычыць Масквы, дык там мне спачатку сказалі, што я буду старшынёй Савета нацыянальнасцяў Вярхоўнага Савета. Але пасля вядомых падзей у Сярэдняй Азіі прыйшлося прыбіраць з Узбекістана Нішанава, якога і прызначылі на гэтую пасаду. Гарбачоў прапанаваў мне ісці ў Камісію па нацыянальных пытаннях Вярхоўнага Савета СССР. Я патэлефанаваў Сакалову і прама сказаў яму, што ён мяне здае. Ён ад усяго адмаўляўся і абяцаў пагаварыць наверсе. Але, безумоўна, гэта была яго ініцыятыва, якую ён і рэалізаваў праз Лігачова.

— А як Вы ацэньваеце дзейнасць Гарбачова?

— Гарбачова і яго дзейнасць аб'ектыўна ацаніць можна будзе толькі гадоў праз дваццаць. Але, на мой погляд, у гэтага палітыка былі два вельмі вялікія недахопы. Першы: ён не быў стратэгам. Другі: у яго, па сутнасці, не было і ніякай тактыкі. Ён ацэньваў стратэгічныя падзеі са "званіцы" правінцыйнага сакратара абкама партыі. Да таго ж не ўмеў падбіраць сабе акружэнне. Гэты палітык умудраўся збіраць вакол сябе адных разбуральнікаў.

А найбольш знакавай фігурай сярод акружэння Гарбачова быў Анатоль Лук'янаў, адзін з бліжэйшых сяброў Генсека. Я не ведаю больш адыёзнай і злавеснай фігуры ў гісторыі СССР і Расіі апошняга перыяду. Дастаткова ўзяць стэнаграмы яго выступленняў на пасяджэннях Вярхоўнага Савета ў апошні год існавання СССР, каб пераканацца ў гэтым. Менавіта гэты чалавек з празмернымі ўласнымі амбіцыямі і быў адным з асноўных далакопаў СССР.

Я добра ведаў Лук'янава — мне давялося працаваць разам з ім у Вярхоўным Савеце. У нас былі даволі складаныя стасункі, бо я разумеў яго галоўную мэту — самому заняць месца Гарбачова. Яны, як вядома, вучыліся разам у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Лук'янаў заўсёды лічыў сябе мацнейшым за Гарбачова і па інтэлекце, і па характары. Але больш удачлівы Гарбачоў заўсёды апынаўся вышэй за сябра. Лук'янаў доўгі час падштурхоўваў Гарбачова і ўсяляк падтрымліваў, спадзеючыся за ягонай спінай дасягнуць і сваіх мэт.

Сёння ўжо няма ніякіх сумненняў, што якраз Лук'янаў быў галоўным ідэйным і духоўным арганізатарам ГКЧП, ягоным сапраўдным лідэрам. Але ГКЧП — гэта яго трагічная памылка. Мэтай Лук'янава, канечне, быў не развал Саюза, а адхіленне ад улады свайго сябра — Гарбачова. Пасля чаго яму як старшыні Вярхоўнага Савета з прычыны нікчэмнасці фігуры тагачаснага віцэ-прэзідэнта Янаева (на гэтую пасаду яго якраз Лук'янаў і прапанаваў з далёка сягаючымі планамі) ужо нішто не магло перашкодзіць стаць прэзідэнтам. Ельцына ён усур'ёз не ўспрымаў. Трэба сказаць, што Лук'янаў быў вельмі блізкі да мэты. Але такім чынам з бутэлькі быў неасцярожна выпушчаны неўтаймоўны і страшны джын рэвалюцыі (бо што як не рэвалюцыя адбылася ў жніўні 1991 года ў Маскве), якога назад ужо было не загнаць. У выніку Саюз рухнуў, а сам Анатоль Іванавіч на некаторы час нават апынуўся за кратамі...

Я наогул лічу, што вялізны з'езд народных дэпутатаў, выбраны ў 1989 годзе, і стварэнне на яго базе Вярхоўнага Савета — усе гэтыя дзіўныя маніпуляцыі сістэмы з дэмакратыяй былі найперш рэалізацыяй асабістых задум Лук'янава, вынікам ягоных, не пабаюся гэтага слова, дэманічных планаў. Думаю, ён, маючы вялікі ўплыў на Гарбачова, усё свядома заблытваў у вышэйшай савецкай палітыцы, каб потым злавіць у мутнай вадзічцы сваю "залатую рыбку". Гэты чалавек ставіў свае кар'ерысцкія планы і ўласныя амбіцыі вышэй за лёс краіны. Гарбачоў, на мой погляд, быў у немалой ступені дэзарыентаваны гэтым сваім злым геніем, своеасаблівым сваім Сальеры. Ён вельмі давяраў Лук'янаву. А пасля ГКЧП, калі атрымаў свой картбланш Ельцын, яшчэ адзін надзвычай амбіцыёзны палітык, працэс развалу СССР стаў ужо некіруемым. Ды і ўсе тагачасныя крокі Гарбачова па захаванні Саюза былі непрадуманымі, калі не сказаць больш...

Воляй лёсу я быў тады непасрэдным удзельнікам тых працэсаў. Выхад з крызісу тады яшчэ быў магчымым. У дакументах, якія прайшлі, дарэчы, праз Вярхоўны Савет СССР, пытанні падзелу паўнамоцтваў паміж цэнтрам і рэспублікамі былі дэтальна прапрацаваны. Зладжаным дакументам заставалася прайсці праз з'езд. Але старшыня Вярхоўнага Савета Анатоль Лук'янаў заблакіраваў гэты працэс, балазе такіх магчымасцяў у яго было нямала. Калі б той варыянт прайшоў праз з'езд і ўвайшоў у Канстытуцыю, то, упэўнены, ГКЧП і Віскулёў не было б.

— Характарызуючы ролю Лук'янава, Вы закранулі вельмі цікавы момант у нашай гісторыі. Тут, напэўна, варта яшчэ раз парварыць пра ролю канкрэтнай асобы ў ёй... Відавочна, што Гарбачоў, Якаўлеў, Ельцын пры ўсіх іх асабістых вартасцях усё ж не цягнуць на ролю дэманічных разбуральнікаў добра адладжанай дзяржаўнай сістэмы, створанай і ўмацаванай людзьмі, маштаб асоб якіх быў значна вышэйшы... Але, як бачым, на гэты працэс маглі паўплываць і асобы, так бы мовіць, "ценявыя". Але тым не менш усе яны былі хутчэй правадырамі канкрэтных гістарычных тэндэнцый...

— Гэта бясспрэчна. Але што датычыць ролі таго ж Лук'янава ў развале СССР, то, я мяркую, яна яшчэ як след не зразуметая сучаснікамі. Калі пасля ГКЧП мы ў Вярхоўным Савеце здымалі Лук'янава з пасады, мой кіроўца, які за некалькі дзён да ГКЧП адпачываў непадалёку ад яго дачы, распавядаў, што ў тыя дні над рэзідэнцыяй Лук'янава пастаянна кружылі верталёты. Рыхтаваліся...

— Дык у чым усё ж была галоўная памылка Лук'янава і ГКЧПістаў?

— Справа ў тым, што кіраўнікі ГКЧП не змаглі прыняць радыкальнае рашэнне наконт Гарбачова і Ельцына. Думаю, на тое не было згоды некаторых прыстойных і сумленных членаў ГКЧП, тых жа Язава, Пуга, ад якіх тады шмат што залежала. ГКЧПісты так і не адважыліся праліць кроў. Што датычыць Лук'янава... Хто ведае, магчыма, паэт Осенеў яшчэ і не спеў сваю лебядзіную песню ў палітыцы.

— Шмат кажуць пра ролю Захаду ў развале СССР...

— Здаецца, яго роля тут перабольшаная. У 1980 годзе мне давялося пабываць у ЗША ў складзе савецкай дэлегацыі. Адна з найбольш папулярных амерыканскіх тэлекампаній звярнулася да кіраўніка нашай дэлегацыі з просьбай даць інтэрв'ю. Ён папрасіў мяне ўдакладніць, якія пытанні можна чакаць. Даведаўшыся, што першым будзе пытанне пра пераемніка Брэжнева, кіраўнік дэлегацыі наадрэз адмовіўся ад інтэрв'ю. Калі я перадаў гэта амерыканцам, яны адказалі, што яны ўжо і самі ведаюць, хто будзе пераемнікам Брэжнева. І назвалі прозвішча Андропава. Заўважце — за два гады да смерці Генсека...

Зразумела, што на Захадзе адсочвалі і аналізавалі сітуацыю ў СССР. Там, безумоўна, усё пралічваюць сістэмна, прафесійна. Але часцей за ўсё ніякага наўпроставага ўплыву не робяць, бо гэта занятак вельмі нятанны. Аднак тым працэсам, тэндэнцыям, у якіх яны зацікаўлены, канечне ж, дапамагаюць.

— Кісінджэр і Бжэзінскі, якіх сёння называюць "духоўнымі бацькамі" развалу СССР, якраз і выяўлялі гэтыя тэндэнцыі?

— Канечне. На Захадзе заўсёды добра ўмелі бачыць перспектывы і спрыялі тым палітыкам і палітычным кланам, якія аб'ектыўна працавалі на разбурэнне варожых Захаду сістэм.

— Калі перайсці да сённяшняга дня, то, відавочна, Захад менавіта так і ставіцца да Беларусі — дае сітуацыі выспець?

— Так. Нягледзячы на негатыўнае стаўленне да нашых улад, Захад, як бачым, не паскарае ходу падзей, а цярпліва чакае. Там, наогул кажучы, некалькі іншы ўзровень палітычнай культуры, які выпрацоўваўся стагоддзямі.

— І ўсё ж, ці падтрымлівае Захад нашую апазіцыю?

— На сённяшні дзень гэтая падтрымка мінімальная, насуперак заявам нашых улад. Яна больш маральная. Але на тое ёсць шмат прычын. На Захадзе выпрацавалі пэўныя правілы гульні і імкнуцца іх не парушаць. Там, я думаю, пакуль яшчэ прыглядаюцца да нашай апазіцыі...

— Чакаюць канчатковага "выспявання"?

— Безумоўна. Але ў прынцыпе тамтэйшыя палітыкі не могуць абыякава ставіцца да сітуацыі ў Беларусі, улічваючы яе геапалітычнае становішча. Апошняе — не толькі наш моцны бок, але і наша бяда. Рэальныя гаспадары свету заўсёды імкнуліся кантраляваць скрыжаванні дарог. Сітуацыя ў Беларусі сёння нашмат больш складаная, чым на Украіне і краінах Балтыі. Захад, пры ўсім яго разуменні сітуацыі, мне думаецца, так толкам і не вырашыў, што рабіць з намі. Таму іх рэальная палітыка тут вельмі асцярожная.

У 1990 годзе мне давялося пазнаёміцца з Джэры Гафам — амерыканскім палітолагам. Ён добра гаварыў па-руску, і мы з ім абмяркоўвалі, што будзе, калі СССР разбурыцца. Мы тады сышліся ў поглядах, што ў гэтым выпадку ёсць дзве рызыкі. Першая — ядзерныя боегалоўкі могуць застацца без сістэмнага кантролю. Другая рызыка — ісламскі фундаменталізм, а гэта — Каўказ, Сярэдняя Азія. І трэцяя — няздольнасць мясцовых палітычных эліт былых саюзных рэспублік распарадзіцца як след атрыманай свабодай...

— Як бачым, сёння з апошнім праблем вялікіх няма...

— Усё так, але каб заняць сваё годнае месца сярод іншых дзяржаў, нашым сённяшнім гаспадарам вядомага дома на К.Маркса трэба не толькі добра арыентавацца ў тактыцы захавання ўласнай улады, але яшчэ і валодаць стратэгіяй. А вось яе не можа быць без дакладных духоўных імператываў, чым заўсёды вызначалася наша апазіцыя...

— Вы намякаеце на нейкі магчымы сімбіёз?

— Я не намякаю, а кажу прамым тэкстам — нацыя можа адбыцца, калі яе лепшыя сілы знойдуць згоду і выпрацуюць кампрамісныя шляхі, без чаго захаваць незалежную Беларусь уяўляецца праблематычным. А калі мы страцім незалежнасць, то хутка згінем як нацыя, асабліва ў моцных "брацкіх" абдымках Расіі. Сёння гэта добра разумеюць і ва ўладных высокіх кабінетах, дзе шмат шчырых прыхільнікаў рэальнай незалежнасці краіны. Але каб выпрацаваць стратэгію для яе захавання, ім таксама патрэбен час і пэўныя ўмовы. Гэта таксама ў большасці ўсё ж беларусы, а гэта значыць — вельмі і вельмі асцярожныя людзі...

У плане прапаганды незалежнасці, дзяржаўнасці значна болей маглі б рабіць нашыя незалежныя СМІ. Яны маглі б больш грунтоўна тлумачыць людзям, што такое *незалежнасць, дзяржава*. А замест гэтага — пагоня за таннымі сенсацыямі, адсочванне ўсіх перамяшчэнняў і выказванняў прэзідэнта ўслед за дзяржаўнай прэсай. Наша незалежная прэса — глыбока правінцыяльная. Яна пакуль не заўсёды здольная сфармуляваць і даходліва данесці да чытача ідэю пра неабходнасць самім вырашаць свой лёс.

— І ўсё ж, калі можна чакаць нейкіх істотных перамен у жыцці нашай краіны? Праз год?.. Праз пяць, дзесяць гадоў?

— Важкіх унутраных фактараў, якія маглі б паспрыяць гэтаму, я пакуль не бачу. Сітуацыя ў Беларусі можа змяніцца, але хутчэй за ўсё, як і ў 1991 годзе, пад уплывам знешніх фактараў...

Размова 2-я, кастрычнік, 2000 год

Апошні званок для Саюза

— У снежні наступнага 2001 года споўніцца роўна дзесяць год, як з карты свету знікла назва СССР — Саюз Савецкіх Сацыялістычных рэспублік. Гэтаму папярэднічаў шэраг знакавых драматычных падзей, якія сталі тымі завяршальнымі "падземнымі" штуршкамі, якія моцна пахіснулі дзяржаўную будыніну-калос пад ганарыстай назвай *Савецкі Саюз*. Першы з тых "штуршкоў-званкоў" быў у Тбілісі ў красавіку 1989 года, калі ўпершыню за перабудовачныя часы пралілася чалавечая кроў. Потым яшчэ больш крывавы снежань 1990 года ў Баку, калі загінулі сотні(!) людзей. І ўрэшце — Вільня студзеня 1991 года, дзе адбылася спроба цэнтральных саюзных улад вярнуць пад свой кантроль інфармацыйнае поле ў рэспубліцы. Спроба тая вылілася ў штурм віленскага тэлецэнтра, што таксама прывяло да ахвяр сярод мірных жыхароў. Як вядома, віленскія падзеі моцна ўскалыхнулі ўсю краіну і, у адрозненне ад закаўказскіх, выклікалі вялікі рэзананс ва ўсім свеце. (Магчыма таму, што Літва была "пад самым носам Еўропы і тут Захаду ніяк не выпадала рабіць выгляд, што гэта чарговыя "издержки перестройки".)

— Георгій Станіслававіч! У тыя драматычныя апошнія гады існавання СССР (ад Тбілісі да Віскулёў) Вы займалі даволі ўплывовую ў іерархічнай сістэме СССР (а галоўнае — звязаную з доступам да інфармацыі!) пасаду старшыні камісіі Вярхоўнага Савета СССР па справах нацыянальнасцяў. Таму былі заўсёды ў эпіцэнтры практычна ўсіх ключавых палітычных момантаў. Якую, на Ваш погляд, ролю адыгралі студзеньскія падзеі 1991 года ў Вільні ў лёсе СССР?

— Не ведаю чаму, але віленскія падзеі студзеня 1991 года мне запалі ў душу найбольш глыбока, хаця мне шмат чаго давялося бачыць у сваім жыцці, а асабліва ў апошнія два гады існавання СССР, калі па родзе сваёй парламенцкай службы калясіў па ўсёй вялізнай краіне з аднаго канца ў другі. (Балазе, тады нагод, звязаных з "нацыянальным пытаннем", не бракавала, то ў адным месцы выбухне, то ў іншым...) Магчыма таму, што Літва не толькі адна з нашых найбліжэйшых суседак, але яшчэ і моцна знітаваная з Беларуссю сваёй гісторыяй, ва ўсе часы неверагодна драматычнай. 1991 год увогуле выдаўся па важнасці падзей надзвычай насычаным, я б сказаў, лёсаносным для ўсіх нас, тагачасных грамадзян вялікага Саюза ССР. Але пачынаецца той трывожны год якраз падзеямі ў сталіцы Літвы — Вільні.

Тады ў студзені ў Вільні, ля будынка мясцовага парламента — сойму — праходзілі бурныя мітынгі. Але гэта былі не тыя, звыклыя для гэтага горада, мітынгі за незалежнасць Літвы ад СССР. На гэты раз арганізатарамі мітынгаў было прамаскоўскае аб"яднанне "Единство". Яны былі скіраваны супраць "Саюдзіса" і тагачаснага старшыні Вярхоўнага Савета Літвы Ландсбергіса. Падзеі развіваліся даволі востра, і становішча ў Вільні станавілася ўсё больш напружаным. З гэтай нагоды ў адзін з тых дзён М.Гарбачоў сабраў у Крамлі пасяджэнне Прэзідэнцкага Савета, куды ўваходзілі ўсе кіраўнікі саюзных рэспублік СССР. На яго запрасілі і мяне. На Савеце не было толькі кіраўніка Літвы Ландсбергіса. Сышліся на тым, што сітуацыя ў Літве сапраўды складваецца вельмі небяспечная і можа выклікаць непажаданыя наступствы.

Па прапанове Гарбачова прынялі рашэнне накіраваць у Літву дэлегацыю Вярхоўнага Савета СССР у складзе Мікалая Дземянцея — тагачаснага Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Лявона Тэр-Петрасяна — старшыні Вярхоўнага Савета Арменіі і некалькіх дэпутатаў. Ім выдзелілі спецсамалёт, і ў ноч з суботы на нядзелю 13 студзеня яны вылецелі ў Вільню. Але мясцовы аэрапорт з-за бясцыдзеяння не прымаў, і самалёт вымушаны садзіцца ў Мінску, дзе дэлегацыя і заначавала. І ў гэтую ж ноч з суботы на нядзелю ў Вільні ўводзяцца вайсковыя часці з танкамі. Адбываецца штурм мясцовай тэлевежы, у выніку якога гіне больш за дзесятак людзей...

Я ў тую ноч знаходзіўся ў Маскве ў адпаведнай гасцініцы. Уначы, слухаючы па шматгадовай "кіраўнічай" звычцы заходнія радыёстанцыі, пад самы ранак лаўлю паведамленне пра трагічныя віленскія падзеі. Адразу тэлефаную Уладзіміру Крючкову — тагачаснаму старшыні КДБ СССР (нумар мой у гасцініцы быў аснашчаны ўрадавай сувяззю). Яго няма на месцы. Няма і Барыса Пугі — міністра ўнутраных спраў. Пашанцавала знайсці Барыса Громава — намесніка Пугі. Пытаюся пра Вільню: ці праўда? Кажа, што праўда. Але падрабязнасці, маўляў, пакуль высвятляюцца. Каля сямі раніцы мне тэлефануе дэпутат Вярхоўнага Савета СССР ад Літвы Мядзведзеў і цікавіцца, ці ведаю мне пра Вільню. Кажу, што вядома... Удаецца, нарэшце, дазваніцца да Кручкова, які таксама пацвярджае, што ў Вільні адбыліся крывавыя падзеі і што ёсць ахвяры.

Еду ў Крэмль і спрабую патрапіць да А.Лук'янава — старшыні Вярхоўнага Савета СССР, але памочнікі не пускаюць — сцвярджаюць, што той моцна заняты. Званю ў Мінск да свайго памочніка, што пастаянна знаходзіўся пры Дземянцеі. Ён якраз і далажыў, што дэлегацыя Вярхоўнага Савета СССР, накіраваная ў Вільню, туды не патрапіла, а начавала ў тую драматычную ноч у Мінску. І што зранку яе адправілі ў Літву на аўтамабілях. На працягу дня мне больш так ніхто і не патэлефанаваў. Я некалькі разоў спрабаваў дазваніцца да Ландсбергіса, але нумар не адказваў. Відаць, якраз у тыя часы ў Вільні праходзіла экстранная сесія Літоўскага сейма.

Раніца, панядзелак, 14 студзеня. У Крамлі пачынаецца пасяджэнне Вярхоўнага Савета СССР. У Прэзідыуме М.Гарбачоў. Дакладваюць толькі што прыбыўшыя з Вільні Дземянцей і Тэр-Петрасян. Рэакцыя дэпутатаў крайне негатыўная. У перапынку да мяне падходзіць Р.Нішанаў — старшыня Савета нацыянальнасцяў і перадае просьбу Гарбачова падысці да яго ў Прэзідыум. Падыходжу і саджуся побач. Гарбачоў мне гаворыць: "Давядзецца табе ехаць у Вільню". Я яму: "Навошта?" "Трэба, — кажа, — там супакоіць сітуацыю..." А я ў адказ цвёрда: "Не паеду!" Гарбачоў здзіўлена глядзіць на мяне. "Па-першае, — кажу, — мы — суседзі з Літвою, па-другое, я не збіраюся заставацца ў Маскве на пастаянную працу. А па трэцяе, не я гэтую кашу заварыў... Ну і самае галоўнае — Ландсбергіс мяне не ўспрыме!" А Гарбачоў мне: "З гэтага і пачынаў бы". Падклікае Нішанава: "Схадзі ў мой кабінет (а адзін з ягоных кабінетаў быў і ў Вярхоўным Савеце, а ўсяго іх у Крамлі было шэсць ці сем) і пазвані Ландсбергісу, ці згодзен ён на Таразевіча?".

Праз нейкі час вяртаецца Нішанаў і дакладвае, што Ландсбергіс на Таразевіча згодзен. Мне няма куды дзявацца... Гарбачоў запрашае мяне папрысутнічаць на ягонай сустрэчы з Дземянцеем і Тэр-Петрасянам. Першым дакладвае Дземянцей. Ягоны даклад мне не спадабаўся — адчуваецца, не разабраўся ў сітуацыі. Яго даволі слушна падкарэкціраваў Тэр-Петрасян. Я ўсё бяру на аловак...

Калі засталіся з Гарбачовым самнасам, я папрасіў яго даць мне дырэктывы, як мне дзейнічаць. Той вельмі спяшаўся на прадстаўленне новага шэфа МЗС Бясмертных, што змяніў тады Шэварднадзе. "Ніякіх, — кажа, — дырэктыў табе не будзе. Ты — мой паўнамоцны прадстаўнік, дзейнічай па абстаноўцы! Падыдзі да Язава і скажы яму, што я даў каманду, каб ён падрыхтаваў табе самалёт!"

Дзмітрый Язаў — тагачасны міністр абароны СССР — па-ваеннаму дакладна паабяцаў, што самалёт будзе гатовы праз дзве гадзіны. Роўна праз дзве гадзіны я сапраўды адляцеў на ТУ-134 з Чкалаўскага аэрапорта на Вільню. На борце, акрамя экіпажу, я і двое маіх памочнікаў.

Прыляцелі позна вечарам. Ля трапа сустракаюць дзве шарэнгі. Злева — шарэнга ваенных на чале з першым намеснікам міністра абароны Варэннікавым, справа — шарэнга цывільных на чале з намеснікам Ландсбергіса. Спускаюся марудна і ліхаманкава думаю: "Да каго ж спачатку падысці і з кім ехаць?" І ўжо амаль што на апошняй ступеньцы трапа прымаю рашэнне ехаць з цывільнымі. Падышоў спачатку да ваенных — павітаўся. І коратка кажу Варэннікаву, паказваючы на цывільных: "Еду з імі...". Варэннікаў абураецца: "Як так?!" "А вось так!" — кажу... І больш нічога не тлумачу... Сказаў толькі, што заўтра зранку пазваню.

Мяне прывезлі ў рэзідэнцыю старшыні Вярхоўнага Савета Літвы. Было ўжо каля дванаццаці ночы, але намеснік наладжвае вячэру. Акрамя яго, прысутнічае яшчэ некалькі дэпутатаў сейма. Адразу пасля вячэры мяне вязуць да Ландсбергіса, які знаходзіўся тады ў будынку парламента. Вакол будынка сапраўдныя надалбы — умацаванні з бетонных пліт. Гарэць кастры, сотні ўзброеных людзей. Узброеныя хто чым, нават паляўнічымі стрэльбамі. Мяне праводзяць праз нейкія лабірынты ў прыёмную да Ландсбергіса. Там моладзь, узброеная аўтаматамі і пісталетамі.

Ландсбергіс, узрушаны да крайнасці, усхвалявана распавядае мне пра падзеі мінулай ночы. Сцвярджае, што гэта была сапраўдная агрэсія, што ваенныя сілай захапілі тэлецэнтр. (Потым стала вядома, што гэта былі не ваенныя, а спецатрад КДБ "Альфа".) Што стралялі нават з пушак, што загінула дванаццаць чалавек. Ды і зараз, — кажа, — на вуліцах страляюць і сітуацыя крайне небяспечная. А я яму ў адказ: "Супакойцеся! Разбяромся! Заўтра я сустракаюся з ваеннымі і нічога тут болей не здарыцца!"

Зранку еду ў Паўночны гарадок, дзе дыслакуецца віленскі ваенны гарнізон. Садзімся з ваеннымі за доўгі стол, на чале якога сядзіць першы сакратар ЦК КП Літвы Буракявічус. З аднаго боку ваенныя, з другога я з памочнікамі. Ваенныя разам з Буракявічусам пачалі актыўна схіляць мяне даць згоду на ўвядзенне ў Вільні надзвычайнага становішча і прамога прэзідэнцкага праўлення. Я выслухаў іх уважліва, але катэгарычна адмовіўся ад такіх прапаноў, бо разумеў, якія з таго могуць быць наступствы. Падчас сустрэчы з Ландсбергісам той распавёў мне, што ў Вільні ўзмоцнена фарміруюцца шматлікія ўзброеныя атрады, гатовыя на ўсё! Я разумеў, якое магло быць кровапраліцце. Размова працягваецца амаль тры гадзіны, але безвынікова. Урэшце мне гэта надакучыла, і я прапаноўваю апанентам звязацца з Гарбачовым і папрасіць яго асабіста прыняць рашэнне. І калі, — кажу, — ён пагодзіцца з вамі, то я ўжо сюды да вас не вярнуся. Калі не, то прыеду і працягнем абмеркаванне...

Прыязджаю ў сваю рэзідэнцыю і сам звязваюся з Гарбачовым. Дакладваю сітуацыю. Ён просіць пачакаць паўгадзіны, і праз такі час звоніць мне і гаворыць, што згодзен са мною. Я еду зноў у Паўночны гарадок і інфармую генералаў. Тыя слухаюць моўчкі з каменнымі тварамі. Потым еду да Ландсбергіса і інфармую яго. Але Ландсбергіс усё ніяк не мог супакоіцца і паверыць, што ўсё скончана. Ён раптам літаральна бярэ мяне за руку і некуды хутка вядзе. Я меркаваў, што ён мяне ўжо выводзіць з парламента, але раптам мы апынаемся ў зале пасяджэнняў літоўскага сейма, які тады бесперапынна засядаў. І не даючы мне перавесці дыханне, Ландсбергіс дае слова. Я ўнутрана абураюся, але разумею ягоны стан. Хочаш не хочаш — трэба выступаць. Я спакойна кажу дэпутатам, што ім больш няма падстаў хвалявацца, што армія больш не будзе ўмешвацца ў сітуацыю...

Потым трэба было зрабіць самае складанае — зняць ваенную ахову з тэлецэнтра. Гэта было зусім няпроста. Нягледзячы на прынятае цэнтрам рашэнне, Буракявічус і ваенныя ўсяляк праціваіцца гэтаму. Але ўрэшце пытанне мне як паўнамоцнаму прадстаўніку прэзідэнта ўдаецца вырашыць.

Усяго я прабыў тады ў Вільні дзесяць дзён. За гэты час нават умудрыўся на выхадныя з"ездзіць дадому ў Мінск. Хаця той жа Ландсбергіс напачатку быў катэгарычна супраць гэтага. Але я пераканаў яго, што ў Мінску са мною лёгка звязацца па ВЧ-сувязі, якая была ўстаноўлена ў мяне на кватэры. І толькі я прыехаў у Мінск. толькі зайшоў у кватэру, як званок. Тэлефанаваў Ландсбергіс, правяраў, ці прыехаў...

Вядома ж за гэтыя дзесяць дзён у Вільні я спрабаваў высветліць, хто канкрэтна заварыў гэтую кашу, хто аддаў загад на штурм і захоп тэлевежы, а значыць, і быў непасрэдным віноўнікам ахвяр мірных віленцаў. Але ніхто, у тым ліку і ваенныя, і Буракявічус, не давалі канкрэтных адказаў. У мяне не хапіла часу, каб правесці нейкае следства, ды гэта і не ўваходзіла ў мае функцыі. Але тым не менш па ўсіх ускосных момантах я ўрэшце зразумеў, што без ведама Масквы, без ведама вышэйшых службовых асоб дзяржавы мясцовае ваеннае начальства ніколі б на гэта не пайшло...

На мой погляд, свае функцыі ў Вільні я тады выканаў цалкам. Самае галоўнае, мне ўдалося не дапусціць увядзення надзвычайнага становішча, а значыць, яшчэ большага распальвання канфлікту, яшчэ больш сур"ёзнага кровапраліцця. Па вяртанні я ўсё далажыў Гарбачову. Памятаю, што падчас майго дакладу ён быў яўна нечым моцна ўстрывожаны, нават узрушаны і, як мне падалося, успрымаў мяне неадэкватна. Відавочна, што тады якраз і разгаралася на самым версе кульмінацыя жорсткай барацьбы за ўладу, у ходзе якой прэзідэнт рабіў сваім апанентам адну саступку за другой. Што ў выніку і скончылася ГКЧП. На мой погляд, літоўскія падзеі былі адным з ключавых звёнаў той барацьбы. І хоць тады Гарбачоў коштам неверагодных высілкаў змог утрымаць сітуацыю, але гэта была ягоная пірава перамога. Ён стаў усё больш вагацца пры прыняцці рашэнняў, чым і карысталіся яго апаненты і акружэнне. Момант, калі ён адмовіўся даць мне дырэктыву наконт Вільні, быў даволі характэрны для яго. Гарбачоў станавіўся ўсё меней упэўнены ў сабе і паступова ўвогуле аказаўся не ў стане рэальна кіраваць сітуацыяй у краіне.

Мусіць, якраз пасля таго майго дакладу Гарбачову ў мяне і пачало з'яўляцца адчуванне, што магутны раней Саюз развальваецца. Было відавочна, што Прыбалтыка, Украіна, Закаўказзе няўхільна адыходзяць, прагнуць "разводу". Трэба было той "развод" правесці як мага больш цывілізавана, з найменшымі стратамі. І такая лінія ў акружэнні Гарбачова, як вядома, таксама была. Але яна, на жаль, урэшце не пераважыла... І я пісаў Гарбачову запіскі на гэты конт, але на іх ніхто не раэгаваў. Апошнія паўгода праўлення Гарбачова было нейкае адчуванне яго агламошанасці сітуацыяй. Мне здаецца, ён з яе так і не выйшаў. У складанейшы для краіны час ён выявіўся не толькі, як я казаў вышэй, нядзатным прымаць важныя рашэнні, але і ў многім нават наіўным, ды і проста недалёкім чалавекам. Ён, на маю думку, так і не змог падняцца да ўзроўню дзяржаўнага дзеяча.

Разам з тым Гарбачоў быў чалавечным і спагадлівым і гэта безумоўна паспрыяла таму, што развал такой вялізнай краіны адбыўся без вялікіх ахвяр, узрушэнняў, якія з'яўляюцца няўхільнымі спадарожнікамі ўсіх рэвалюцыйных часоў. Як я ўжо казаў, маштаб фігуры гэтага чалавека і яго рэальнае месца ў гісторыі здольны ацаніць толькі час.

Зразумела, у факце развалу Саюза было шмат аб'ектыўных фактараў, але суб'ектыўны фактар Гарбачова быў таксама вельмі моцны. Ды і не толькі яго. У прыватнасці, і ўжо згаданая мною ў мінулай размове з вамі злавесная роля тагачаснага старшыні Вярхоўнага Савета СССР А.Лук'янава, які, я глыбока ўпэўнены, меў найгалоўнейшае дачыненне і да віленскіх падзей студзеня 1991 года.

Я прывяду толькі адзін факт. Як мне потым далажылі, літаральна праз паўгадзіны пасля майго выступлення ў літоўскім парламенце тэкст яго ляжаў на стале ў Лук'янава і ён выявіў крайнюю незадаволенасць тым выступленнем...

Віленскія падзеі былі знакавымі ў лёсе СССР і ў тым, што ўпершыню навідавоку выявілі глыбокі раскол у вышэйшым кіраўніцтве вялікай краіны, што моцна паспрыяла яе агоніі. Гэтыя падзеі, па сутнасці, сталіся для Саюза апошнім званком... Літаральна праз некалькі месяцаў пасля гэтых падзей Вільня заявіла аб сваёй незалежнасці ад СССР. На з'ездзе народных дэпутатаў СССР, які тады адбываўся, я прапаноўваў прызнаць гэтую незалежнасць, бо ўжо было зразумела, што Літву не ўтрымаць.

Калі б цэнтр ўсё ж паспрабаваў тады зрабіць гэта сілай, то гэта была б мажліва не зусім Чэчня, але нешта вельмі падобнае. Ідэю незалежнасці падтрымліваў у асноўнай сваёй масе народ Літвы. І падчас свайго знаходжання там я ў тым добра пераканаўся. Сыграла ролю высокая нацыянальная самасвядомасць літоўцаў, чаго, дарэчы, заўсёды бракавала нам, беларусам.

Словам, трэба было, як кажуць, годна выходзіць з сітуацыі і ратаваць тое, што яшчэ заставалася. Але з'езд тады адхіліў маю прапанову і ўсё скончылася ГКЧП. У выніку страты для народаў СССР аказаліся значна большымі, чым магло быць...

(Працяг — у наступных нумарах.)

Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ.

ОПРОС

«Лекарственный рынок Беларуси только начинает развиваться...»

Минчанка Людмила Абрамович пожаловалась, что не смогла купить гормональный препарат “Будесонид”, необходимый при лечении астмы. Галина Викторович из Витебска написала, что в аптеках их города нет капель от насморка “аллергодил”, которым летом пользуется ее внук-школьник.

Лекарственный рынок Беларуси в последние годы претерпевает изменения. Правительство страны потребовало от фармопроизводителей разработать и наладить выпуск около 200 новых наименований лекарственных препаратов отечественного производства. К 2010 году на территории Беларуси должно быть зарегистрировано 700 наименований отечественных лекарственных средств. Чиновники из Минздрава говорят, что разнообразие местных лекарств ни в коем разе не скажется на присутствии в аптеках страны импортных таблеток, мазей, гелей. А то, что некоторые из них невозможно отыскать сегодня, называют небольшим недоразумением, обещают разобраться.

Удовлетворяет ли Ваши потребности лекарственный рынок Беларуси? Не лишены ли мы выбора при покупке таблеток? —

с таким вопросом мы обратились к фармацевтам, врачам и пациентам.

Елена ДУБОВКА, консультант фитоаптеки “Ирина Фарм”:

— Считаю, что лекарственный рынок Беларуси только начинает развиваться. Часто к нам обращаются люди с просьбой привезти тот или иной препарат из Москвы. В российской столице выбор лекарств значительно лучше. Там на порядок больше импортных препаратов прошли регистрацию, чем у нас. Я и сама не раз сталкивалась с тем, что в государственных аптеках не было нужных мне лекарств.

Ольга НИКИФОРОВА, провизор, г.Минск:

— На мой взгляд, с рынком лекарств в Беларуси дела обстоят неважно. Нужные для эффективного лечения препараты не всегда у нас есть. Многие мои знакомые привозят их из соседних стран.

Александр ВОЛЧАНИН, ликвидатор-чернобылец, врач “скорой помощи” г.Жодино:

— Приобрести лекарства сегодня не проблема, были бы у пациента деньги. Аптеки и государственные, и частные стараются работать “наперегонки”, чтобы привлечь покупателей. Другое дело, что если болезнь серьезная и лечить ее надо месяцами, то, как правило, у больных не всегда находятся деньги на качественные дорогостоящие лекарства.

Тамара ТЯБУТ, кардиолог:

— Выбор лекарств у нас есть, их достаточно на рынке Беларуси. Правда, согласно программе импортозамещения, зачастую врачам приходится выписывать пациентам-льготникам отечественные препараты. Однако на дорогие зарубежные аналоги, считаю, не всегда находятся деньги у наших больных.

Нелли ОРЕХОВА, пенсионерка:

— Читала, что в богатых европейских странах “смерти подобно” глотать таблетки. Там вся работа с пациентами в первую очередь направлена на профилактику болезней. Населению говорят о пользе сбалансированного питания, трав, витаминов. А что у нас? У меня, у моих знакомых пенсионеров дома горы лекарств, нужных и ненужных. Запасы на года делаем, боимся, что вдруг скачок цен на лекарства произойдет. Но забитая под завязку таблетками аптечка все равно здоровья не прибавит.

Иван АВДЕЙ, инвалид II группы:

— Что выпишет врач, то и покупаю в аптеке. Состояние у меня стабильно удовлетворительное, но улучшения от лечения не ощущаю. Может быть, мне нужны другие лекарства, я не знаю. Но, наверное, их нет в продаже, если мой врач их не выписывает.

Елена СКУРАТОВИЧ, психиатр:

— Несомненно, хотелось бы, что в наших аптеках был более широкий ассортимент лекарственных средств, чтобы покупательская способность наших людей была повыше. Это позволило бы назначать пациентам другие препараты, варьировать их друг с другом, добиваясь улучшения здоровья больного.

Наталья ПЕТРОВА.

АПЕРАЦЫЙНАЯ

Прэм’ера кардыяхірургіі ў Віцебску

На рэканструкцыю Віцебскай абласной бальніцы плануецца выдаткаваць у чатыры разы менш сродкаў, чым на абнаўленне Летняга амфітэатра — галоўнай сцэны “Славянскага базару”.

“Сэрца на далоні” — такую назву меў папулярны ў свой час раман Івана Шамякіна. Гэты вобраз цалкам рэальны, калі весці гаворку пра такую, на жаль, запатрабаваную цяпер хірургічную аперацыю, як аортакаранарнае шунціраванне — самы радыкальны і часта неабходны спосаб паратунку ад ішэмічнай хваробы сэрца. Шунціраванне робіцца на адкрытым сэрцы, якое на кароткі час дастаецца з грудной клеткі і працуе з дапамогай адмысловай апаратуры.

На пачатку ліпеня 2007 года, якраз напярэдадні чарговага фестывалю “Славянскі базар”, аортакаранарнае шунціраванне ўпершыню было праведзена ў Віцебску, на базе абласной клінічнай бальніцы. Першага пацыента, 53-гадовага рабочага з Наваполацка, аперыравала брыгада мінскіх хірургаў на чале са славутым урачом — доктарам медыцыны, прафесарам, кіраўніком лабараторыі кардыяхірургіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра “Кардыялогія” Юрыем Астроўскім. Следам за першай аперацыяй гэтая брыгада зрабіла ў Віцебску яшчэ чатыры аналагічныя. Асістэнтамі ў гасцей са сталіцы былі мясцовыя медыкі.

Стан аховы здароўя ў Віцебску найгоршы ў параўнанні з іншымі раёнамі, і таму горад на Заходняй Дзвіне апошнім з абласных цэнтраў распачынае асвойваць кардыяхірургію. Першыя аперацыі аортакаранарнага шунціравання сталі рабіцца ў Мінску з канца 1960-х гадоў, потым, праз 30 год, у Гомелі. На пачатку бягучага года эстафету прыняў Магілёў, а цяпер — Віцебск. Праўда, варта ўзгадаць, што быў у Віцебску выдатны хірург — франтавік, прафесар Уладзімір Бажэнаў, які рабіў аперацыі на адкрытым сэрцы каля 40 год таму, але яго тады не падтрымалі, і гэта адсунула развіццё кардыяхірургіі ў Віцебску аж да цяперашняга часу.

Як бы там ні было, але кароткая серыя шунціраванняў, праведзеных Н.Астроўскім у Віцебску, з’яўляецца важным крокам наперад у ахове здароўя на Беларусі, бо падштурхне развіццё кардыяхірургіі ў правінцыі, дзе патрэба ў ратаванні хворых ад інфарктаў сэрца не меншая, чым у вялікіх гарадах. Распаўсюджванню аортакаранарнага шунціравання ў “глыбінцы” перашкаджае недастатковае фінансаванне нашай медыцыны, яе слабая тэхнічная база. Калі ў высокаразвітых краінах штогод на 1 мільён насельніцтва робіцца 800 аперацый на сэрцы, то ў нас — шматкроць менш. У ЗША, Японіі, многіх краінах Заходняй Еўропы і нават Афрыкі аортакаранарнае шунціраванне даўно з’яўляецца будзённай практыкай бальніц у маленькіх гарадах. А ў нас нават такія прамысловыя цэнтры, як Орша, Полацк і Наваполацк, аб такіх аперацыях пакуль толькі мараць, бо няма элементарнага апарата штучнага кровазвароту, няма фінансавай магчымасці накіраваць хірургаў на практыку ў Мінск або Гомель. Між тым неабходнасць у распаўсюджванні кардыяхірургіі расце з кожным годам — ад інфарктаў міякарда гінуць тысячы хранічных хворых.

Як патлумачыў галоўны ўрач Віцебскай абласной клінічнай бальніцы Віктар Аўчыннікаў, для асваення ў ягонай медустанове масавых аперацый аортакаранарнага шунціравання спатрэбіцца не менш як 10 год, бо ў бальніцы, пабудаванай 30 год таму, ніколі за гэты час не было капітальнага рамонту. Праўда, удакладніў Віктар Васільевіч, два гады таму за бюджэтны кошт былі збольшага адрамантаваны і пераапрацаваны асобныя аперацыйныя і аддзяленне рэанімацыі, але гэтага недастаткова для таго ўзроўню хірургіі, які прадэманстравалі сталічныя хірургі. Трэба набываць сучасны апарат кровазвароту, шэраг аналізатараў, шоўны матэрыял, інструментарый ды іншае. Поспех аперацый, праведзеных легендарным Ю.Астроўскім на базе таракальнага аддзялення галоўнай клінікі Віцебска, быў абумоўлены не існуючым узроўнем мясцовай медыцыны, а талентам і самаадданасцю доктара Астроўскага і ягоных калег.

Апошнім часам у абласной бальніцы пачалася грунтоўная рэканструкцыя, на якую за 2008—2010 гады плануецца выдаткаваць каля 11 мільярдаў рублёў — прыкладна ў чатыры разы менш за суму, якая спатрэбілася для абнаўлення Летняга амфітэатра ды іншыя мерапрыемствы па аздабленні “Славянскага базару”.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Европа отказалась от ртутных градусников

Десятого июля Европейский парламент принял решение запретить на территории Евросоюза использование ртути в термометрах и других измерительных приборах.

Запрет введен в рамках европейской “Стратегии против ртути”, предложенной в 2005 году. Европейские законодатели надеются таким образом снизить выбросы ртути в атмосферу на 33 метрические тонны в год.

Помимо этого, стратегия предусматривает полный отказ от импорта ртути к 2011 году. Ртуть является высокотоксичным элементом, который при попадании в сточные воды превращается в свою самую токсичную форму — метил ртуть, накапливающуюся в пище.

В соответствии с введенным запретом ртуть нельзя использовать в термометрах, приборах для измерения давления в больницах, а через два года — в продаваемых населению барометрах.

Единственным исключением станут антикварные ртутные барометры, которые по традиции используют в Великобритании, сообщает Dow Jones.

В то же время запрет будет распространяться только на новые приборы, а производителям будет выделено два года переходного периода, чтобы перейти к производству альтернативных безртутных термометров, барометров и тонометров.

После принятия соответствующего решения депутатами Европарламента в ближайшем будущем запрет вступит в силу на территории всего Евросоюза, так как, по словам представителей Еврокомиссии, его введение поддерживают все страны — члены ЕС.

КАНСУЛЬТАЦЫЯ

З ванітамі можна справіцца

Да мяне на лецішча прыехала дачка з трохмесячнай унучкай. Немаўля вельмі часта зрыгвае малако пасля кармлення. Ці трэба нам звяртацца да доктара?

Алена Батурына, Мінск.

— Нованароджаныя маюць асаблівасць зрыгваць невялікую колькасць малака пасля кармлення. Гэта нармальна, — адказвае педыятр Ірына Цішкоўская. — Ваніты адрозніваюцца ад зрыгвання большай колькасцю выкідваемай вонкі ежы. Гэта можа быць прыкметай захворвання дзіцяці. Небяспечна тым, што дзіця губляе шмат вадкасці. Таму трэба ведаць, як дапамагчы яму ў гэтым становішчы.

Калі ў дзіцяці моцная рвота, не давайце яму піць каля гадзіны. Потым пачынайце пакрыху паіць вадою, а лепей рэгідронам, які можна набыць у аптэцы. Рабіце гэта на працягу 8 гадзін.

Калі рвота не паўтараецца, можна пакрыху пачынаць даваць грудное малако альбо малочную сумесь. Калі дзіця ўжо есць густую ежу, можна спачатку даць лыжку густой кашы альбо сухарык. Калі трэба выклікаць доктара? Калі ваніты паўтараюцца больш за два разы. Калі Вы мяркуеце, што дзіця з’ела нешта атрутнае. Калі малое цяжка прачынаецца. Калі яму няма яшчэ 3 месяцаў. Калі ў яго ваніты цёмна-карычневага колеру альбо з крывёю. Калі дзіця адмаўляецца піць. Калі ў малога сухія вусны, няма слёз, калі яно плача, вочкі запаўшыя, пялюшкі застаюцца сухімі — ўсё гэта прыкметы абязводжвання арганізма.

Кошка — угроза здоровью?

Британские ученые в результате длительных исследований пришли к выводу, что наличие в доме существа семейства кошачьих может спровоцировать сильный аллергический приступ даже у практически здорового человека.

Исследование не оставило сомнений, что кот в доме — главный провокатор аллергии и астмы. Исследование британских медиков показало, что, даже если человек не имеет предрасположенности к данным заболеваниям, наличие “мурзика” в доме может являться сильным аллергеном.

Медики не призывают избавляться от пушистого и такого уютного существа, однако предупреждают, что именно кошачьи в значительной мере способствуют формированию у человека аллергических и астматических проявлений.

Как справиться с приступом панкреатита?

Опоясывающая боль в верхней части живота — характерный признак панкреатита. Возникает он при воспалении поджелудочной железы, которым по статистике чаще страдают женщины, чем мужчины, и многие из его жертв — блондинки до тридцати лет. Однако испытывать железу на прочность не рекомендуется никому — она жестко реагирует, когда не считаются с ее интересами.

Какие функции выполняет в нашем организме поджелудочная железа, как справиться с приступом панкреатита? Наших читателей консультирует гастроэнтеролог **Марина РОМАНЕНКО.**

Простуда и ссора с начальником одинаково опасны

У поджелудочной железы сотни врагов. Она может воспалиться после травмы живота, если попали в него волейбольным или теннисным мячом, из-за простуды, гриппа и герпеса, а также на фоне аппендицита, гастрита, пищевой аллергии, переедания и неправильного питания с преобладанием жирного и сладкого. Если поссорились с бой-френдом, поругались с начальником, переутомились или находитесь в стрессовом состоянии, шансы заболеть панкреатитом резко повышаются.

«Пожирающая» саму себя

За день поджелудочная железа вырабатывает почти 800 г панкреатического сока, обладающего огромной переваривающей способностью. В его составе есть компоненты, расщепляющие жиры (липаза), белки (трипсин) и углеводы (амилаза). Чтобы обезопасить от “самопереваривания”, железа производит вещества, подавляющие активность собственных ферментов. В норме они обретают силу, попав в кишечник и смешавшись с пищей. Если по каким-либо причинам ферменты активизируются преждевременно, железа повреждается.

Включить механизм “самопереваривания” помогают издержки анатомии, располагающие к панкреатиту. Дело в том, что протоки, по которым панкреатический сок и желчь попадают в двенадцатиперстную кишку, при впадении в нее сливаются в единую ампулу. Если давление в ней резко повышается (так бывает при наклонах, спортивных тренировках на полный желудок, переедании), желчь забрасывается в поджелудочную железу, активизирует ее ферменты и запускает процесс саморазрушения, приводящий к воспалительно-деструктивному синдрому.

На острие ножа

Главные признаки острого панкреатита — мучительная опоясывающая боль в верхнем отделе живота (эпигастрии), как правило, отдающая в спину, тошнота, рвота, вздутие живота, слабость. Если возникли такие симптомы — немедленно вызывайте “скорую”. До приезда врача откажитесь от еды и питья, они способствуют дополнительному раздражению поджелудочной железы. Приложите к больному месту грелку с холодной водой или пузырь со льдом, завернутый в полотенце.

Не принимайте никаких лекарств до приезда врачей — они “смазывают” клиническую картину и затрудняют диагностику. Чтобы уменьшить боль, ложитесь в постель и расслабьте мышцы живота. Не отказывайтесь от лечения в больнице, даже если покажется, что стало легче. При остром панкреатите бывает непродолжительный период мнимого благополучия, вслед за которым болезнь возвращается с удвоенной силой.

Хронический панкреатит развивается из острого при несвоевременном лечении или же сразу формируется как самостоятельное заболевание. При его обострении, которое обычно происходит после праздничных застолий, возникает боль в верхней половине живота, больше слева, отдающая в спину.

Пропадает аппетит, появляются тошнота, рвота, а также обильные, густые, похожие на глину испражнения. В этом случае назначают прием различных панкреатических ферментов, а также диету без жира и с уменьшенным содержанием углеводов.

Диета после приступа

В течение месяца после обострения панкреатита, а также во время гриппа, простуды и других инфекций, при обострении гастрита и пищевой аллергии придерживайтесь щадящей диеты, которая уменьшает нагрузку на поджелудочную железу.

Исключите крепкие бульоны, жирные, острые и кислые блюда, колбасу, сосиски, сардельки, субпродукты, копчености, квашеную капусту и другие соленья, консервы, икру и жирную рыбу (севрюгу, осетрину, палтуса, кефаль, сома, карпа). Под запретом орехи, грибы, бобовые, черный хлеб, пшено, свежая выпечка, торты, пирожные, карамель, мороженое, жевательная резинка, квас, кофе, какао, шоколад, цитрусовые, газированные напитки. Не увлекайтесь свежими фруктами, которыми обычно закармливают заболевшего члена семьи заботливые родственники. Витамины, конечно, очень нужны выздоравливающему организму, но сильное сокогонное действие сырых овощей (особенно белокочанной капусты, редиса, репы и брюквы), зелени (щавеля, шпината, салата) и фруктов не на пользу поджелудочной железе. 1—2 банана или сладких спелых яблока без кожуры не повредят здоровью, но кислые плоды противопоказаны, зато рекомендуются печеные яблоки, отварные, тушеные овощи.

www.newizv.ru

СТАТИСТИКА

Сельские жители чаще городских заканчивают жизнь самоубийством

По данным исследования врачей Белорусской академии последипломного образования, в Беларуси суициды занимают пятое место в списке причин смертности.

Медики провели анализ распространенности суицидов в Беларуси с 1990-го по 2002 год. Выяснилось, что, например, в 2001 году среди европейских государств Беларусь занимала третье место по уровню суицидов (33,2 случая на 100.000 населения в год). Впереди нашей страны в этом списке стояли только Литва (43,8/100.000) и Российская Федерация (37,9/100.000). При этом надо учитывать, что, согласно статистике, в современной Европе добровольно уходят из жизни 18 человек на сто тысяч населения в год.

В 2002 году смертность от суицидов занимала в Беларуси пятое место. Чаще всего белорусы умирали по причине болезней сердца и сосудов, онкологических заболеваний, болезней органов дыхания и органов пищеварения. На что обратили внимание врачи БелМАПО — смертность от дорожно-транспортных происшествий и убийств в Беларуси была значительно ниже смертности от суицидов. На дорогах страны в 2002 году погибло 22,2 человека на 100.000 населения, было убито 11,5 человека на 100.000 населения.

Если говорить о динамике, то за последнее десятилетие количество суицидов значительно увеличилось. В 1990 году добровольно ушли из жизни 20,5 человека на 100.000 населения, а в 1996 году уже было зафиксировано 35,3 случая суицидов на 100.000 человек (темп прироста 72%). Сейчас наблюдается незначительное снижение случаев самоубийств в Беларуси. В 2002 году зафиксировано 33,3 суицида на 100.000 человек.

Врачи отмечают рост уровня суицидов в сельской местности. Соотношение уровня “сельских” суицидов к “городским” в 2002 г. составило примерно 2:1. Среди факторов, которые предположительно могут быть связаны с различиями коэффициентов смертности, врачи называют следующие: уровень потребления алкоголя населением, заболеваемость алкогольными психозами и алкоголизмом, уровни безработицы и разводов, религиозные традиции.

Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

У пошуках Слонімскіх скарбаў

У Мінску ў выдавецтве “Кнігазбор” выйшла надзвычай цікавая кніга “У пошуках Слонімскіх скарбаў”. Гэта гісторыка-краязнаўчыя і літаратурныя нататкі таленавітага пісьменніка, гісторыка, краязнаўца і журналіста Сяргея Чыгрына. Аўтар нарадзіўся на Слонімшчыне, у вёсцы Хадзявічы. Скончыў тэатральнае аддзяленне Магілёўскага культасветвучылішча і філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працуе намеснікам галоўнага рэдактара “Газеты Слонімскай”. З-пад яго пяра выйшлі зборнікі вершаў “Шчырая Шчара”, “Горад без цябе”, гісторыка-краязнаўчая кніга “Янка Купала і Слонімшчына”, “Родам са Слонімшчыны”, “Чамяры і чамяроўцы”, “Пакліканыя на родны парог”.

Ён падрыхтаваў і выдаў у Беластоку літаратурную спадчыну Станіслава Грынкевіча, Франука Грышкевіча, Уладзіслава Казлоўчыка (“Вяртанне да сваіх”) і гістарычную спадчыну Міколы Шкялёнка (“Беларусь і суседзі”).

З’яўляецца сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў, Беларускай асацыяцыі журналістаў і Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

Кніга “У пошуках Слонімскіх скарбаў” разышлася літаральна за пару тыдняў. І гэта невыпадкова. Той, хто жыве на Слонімшчыне, або той, у каго тут засталіся карані, проста не можа ёй не зацікавіцца, сэрца не можа застацца абыякавым да дзівосных радкоў. Сяргей Чыгрын упэўнены, што горад над Шчарай у найбліжэйшы час абавязкова павінен стаць турыстычным горадам. Хаця сёння людзі, якія прыязджаюць сюды, знаёмяцца толькі з адным маршрутам: Слонім—Жыровічы. Вядома, наведваюць яны і краязнаўчы музей, які прымае штогод каля 25 тысяч чалавек.

Некалькі гадоў таму аўтар сустрэў у цэнтры Слоніма чалавека сярэдніх гадоў з фотаапаратам і кінакамерай.

— Скажыце, калі ласка, — запытаўся незнаёмец, — як мне знайсці тэатр Агінскага? Я прыехаў з Санкт-Пецярбурга, каб зрабіць здымкі тэатра. Але ў каго ні запытаю — ніхто не ведае.

— Я вас засмучу, але будынак тэатра ў Слоніме не захаваўся, яго знішчылі час, войны і людзі. Толькі захавалася аўстэрыя. (Аўстэрыя азначае заезджы дом тыпу карчмы. Паходзіць слова ад італьянскага.) У ёй цяпер знаходзіцца школьны навучальна-вытворчы камбінат, — з горыччу паведаміў Сяргей Чыгрын незнаёмцу.

Аўтар кнігі паказаў здзіўленаму госцю месца, дзе калісьці стаяў тэатр. Але чалавеку, які першы раз прыехаў у Слонім, гэтага было мала. Ён столькі многа чытаў пра тэатр Агінскага, а ўбачыў... пустое месца.

Аўтар кнігі ўпэўнены, што турыстычнае знаёмства са Слонімам павінна пачынацца з плошчы Льва Сапегі. Там павінен стаяць помнік канцлеру Вялікага княства Літоўскага, там павінен быць і музей, прысвечаны Сапегам. Адтуль турысты ехалі б да Агінскіх. Пасля экскурсаводы павялі б іх у сінагогу, пабудаваную ў 1642 годзе. Яе даўно хацелі рэстаўраваць, а ў самой сінагозе планавалі зрабіць рэспубліканскі музей яўрэйскага мастацтва. Але пакуль там нічога не зроблена, ды і 400-гадовы храм развальваецца.

Пасля сінагогі турысты маглі б наведаць Слонімскі раённы краязнаўчы музей імя Язэпа Стаброўскага, музей беларускай кнігі ў раённай бібліятэцы імя Якуба Коласа і музей імя Аляксандра Жукоўскага ў СШ №4.

Пасля знаёмства з цэнтрам Слоніма турыстаў чакаў бы Альбярцін з музеем Пуслоўскіх і паркам, а таксама гатэлем і рэстаранам. Пасля Альбярціна турысты ехалі б у Жыровічы.

А цяпер можна падлічыць, колькі грошай ад наведвання слонімскіх гістарычных мясцін, музеяў, рэстаранаў, гатэляў, ад продажу сувеніраў засталося б у бюджэце Слоніма. А пасля атрыманыя сродкі можна было б укласці ў новыя слонімскія маршруты — у музей Міхала Валовіча ў Парэччы, у музей знакамітых аднавяскоўцаў у Чамярах, у Кракоцкі музей-бібліятэку.

Але, як справядліва піша аўтар, пра такія музеі ў Слоніме можна толькі марыць. Вядома, на гэта трэба час і фінансы, — але гады ідуць, а горад губляе грошы. Вось толькі турысты ў Слонім па-ранейшаму едуць. Едуць, каб адчуць эпоху Сапегаў і Агінскіх...

Далей аўтар, сапраўдны патрыёт сваёй Айчыны, з глыбокім жалем піша, што сёння цяжка і нават немагчыма пералічыць усе тыя нацыянальныя багацці, што стагоддзямі вывозіліся са Слонімскай зямлі ў блізкія і далёкія краіны свету. Шмат слонімскіх скарбаў знікла падчас розных войнаў, але найбольш — у гады Першай і Другой сусветных войнаў. На захад і ўсход захопнікі вывозілі каштоўныя кнігі, рукапісы, карціны, фотаздымкі, дываны, габелены, музычныя інструменты, крыжы і абразы, манеты, медалі, фаянс, вырабы з дрэва, золата, зброю і срэбра. Шмат разоў рабаваліся слонімскі музей, архівы, Жыровіцкая семінарыя, палац Слізняў у вёсцы Дзевяткевічы, тэатр Агінскага ў Слоніме і палац Пуслоўскіх у Альбярціне.

Абкрадаліся Жыровічы. Рабаваліся храмы розных канфесій у Слоніме. Пасля паўстання 1863 года царская ўлада пачала закрываць каталіцкія касцёлы. У снежні 1864 года расфарміравалі бібліятэку касцёла бернардынцаў у Слоніме. Рукапісы і многія кнігі апынуліся ў Віленскай цэнтральнай публічнай бібліятэцы. А касцёльная бібліятэка ў Слоніме тады складалася з 2774 тамоў, пераважна старадрукаў.

Невядома куды знікла мэбля антычных часоў, партрэты Слізняў і Тышкевічаў, фамільнае сталовае срэбра, фарфор, шкло, персідскія кілімы.

Апусцеў у 1914—1944 гадах і палац Пуслоўскіх у Альбярціне. Рабавалі яго бальшавікі і немцы. Сёе-тое Пуслоўскім удалося вывезці ў Вялікабрытанію, але большая частка Альбярцінскіх каштоўнасцяў паехала ў Германію і Расію.

Пра гісторыю старажытнага горада можна пісаць бясконца. Пра адны толькі вуліцы Слоніма, пра іх з’яўленне, знішчэнне, перайменаванне і адраджэнне можна выдаць добрую манаграфію. Бо вуліцы Слоніма — гэта ягонае аблічча. Яны павінны і адпавядаць свайму часу, і захоўваць гістарычнае аблічча горада. На вялікі жаль, сёння не адпавядаюць часу многія назвы беларускіх вуліц.

Аўтар прапаноўвае адсачыць, як у пасляваенны час у Слоніме перайменоўваліся вуліцы, плошчы і завулкі. Так, Альбярцінская вуліца стала вуліцай Гагарына, Жабінка — П.Марозава, Ліпавая — Мірошніка, Жыровіцкая — Марыса Тарэза, Замкавая — Камсамольская і іншыя. Гэтымі савецка-камуністычнымі назвамі парушылася славутая гісторыя старажытнага горада.

Сяргей Чыгрын цікава і змястоўна расказвае пра людзей, імёнамі якіх некалі былі названы вуліцы горада. Сярод іх Міхаіл Казімір Агінскі, Міхаіл Анішчык, Францішак Багушэвіч, Іван Дабрыян і многія іншыя.

Ён успамінае, як вандраваў па родным краі з Уладзімірам Ягоўдзікам, Сяргеем Плыткевічам і Мікалаем Ракевічам, як прыязджаў на Слонімшчыну славуты Уладзімір Караткевіч. Цікава апавядае аб тым, як жыла на Слонімшчыне польская артыстка Аліна Яноўская-Заблоцкая.

Нікога не пакінуць раўнадушнымі радкі пра сталінскія рэпрэсіі, у віры якіх загінула шмат слонімскіх святароў розных канфесій. Гэта і наглядчык Жыровіцкага духоўнага вучылішча Пётр Палянскі, і настаяцель Жыровіцкага манастыра айцец Ціхан Шарапаў, архімандрыт Серафім Шахмуця.

Спіс ахвяр рэпрэсій на Слонімскай зямлі, па словах аўтара, можна доўжыць і доўжыць, бо тут амаль няма такой сям’і, якую б не зачапілі рэпрэсіі акупантаў і дыктатараў. Але, як пісала Надзея Дземідовіч, век так не будзе.

Каштоўнасць кнігі Сяргея Чыгрына “У пошуках Слонімскіх скарбаў” цяжка пераацаніць. Ёй будуць захапляцца і тыя людзі, што жывуць на гэтай зямлі цяпер, і тыя, якія народзяцца тут праз многія дзесяцігоддзі.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.



Слонімскі раён.

Сяргей ЧЫГРЫН

«Мне асвятляе сны мая Айчына»

Новыя вершы

Калі...

Калі Полацак ёсць,
Еўфрасіння —
Не загіне наш край,
Не загіне.
Калі ёсць Наваградак
І Крэва —
Значыць, нас не зламаюць,
Як дрэва.
Бо Нясвіж ёсць,
І Белая вежа...
Значыць, мы
Беларусі належым!

* * *

О, Беларусь — святая каралева,
Дзе золатам бліснуць здалёк Пагоня...
Наш Вітаўт ўцёк з вязніцы Крэва,
Чужынцы ж гоняцца за ім і сёння.

Міхал Валовіч

Памяці кіраўніка паўстання 1830 года на Беларусі

Мураўёвы цябе не зловяць —
Ты ў нашых сэрцах жывеш,
Вялікі Міхал Валовіч,
Як мова, як песня, як верш.
І ніхто нас ніколі не зломіць,
І мы не скарымся ім...
Ты з намі, Міхал Валовіч,
Як Айчына, як сцяг, як гімн!

* * *

Мне па начах мая Рагнеда сніцца,
Старыя Вільня, Полацк і Заслаўль.
Таму мне на радзіме добра спіцца,
І светлых сноў губляць заўсёды жаль.
То Вітаўт ў сны загляне, то Скарына,
То Еўфрасіння, то Багрым...
Мне асвятляе сны мая Айчына,
Каб я ніколі тут не быў чужым.

1938 год

Пастукалі у дзверы хаты:
— Хто там?
— НКВД! Адчыняй!
Забралі раніцай тату;
Ад стрэлаў — спалохаўся гай.
Асіны дрыжэлі і клёны,
Дубы жалудамі плакалі...
— Адчыняй! — крычалі шалёна,
У шыбы білі прыкладамі.
І ў новых стралялі ахвяраў...
— За што? — шумелі бярозы...
Ды кулі знішчалі іх мары
І крыжавалі лёсы.

Актава

Каляды. Купалле. Каліна.
Калоссе. Каханне. Каміла.
Княства. Кларнет. Кавярня.
Купала. Куфар. Кнігарня.
Камень. Калодзеж. Крыніца.
Касьба. Кветка. Кісліца.
Клунак. Клопат. Карэц.
Крыўда. Клямка. Канец.

Перыферыя?

Якія тут сосны! Якія дубы!
Якая маліна, якія грыбы!
Якія тут студні з гаючай вадой
І на лугах у расе травастой.
Якія тут вербы каля ракі!
Якія дваюльныя ў нас мужыкі!
Якія прасветлыя дзевы Марыі...
А вы мне ўсё кажаце: перыферыя...

Зорка

Зорны сустрэне віхор,
Вецер спаткае золкі.
Я палячу да зор,
Каб адшукаць тваю зорку.
І пакладу на далонь,
Хай яна тут застаецца...
Зорка — святы агонь,
Будзе лячыць маё сэрца.

Малітва

Разам з народам сваім застануся -
Гору дамо мы рады,
Дайце дарогу маёй Беларусі
Да Праўды!
Ні перад кім мой народ не сагнуўся -
Зведаў цяжар нядолі,
Дайце дарогу маёй Беларусі
Да Волі!
Разам з народам не адступлюся -
Тут крывічоў пакаленне,
Дайце дарогу маёй Беларусі
Да Адраджэння!
Богу за ўсё на зямлі пакланюся
І папрашу міласэрнасці,
Дайце дарогу маёй Беларусі
Да Незалежнасці!

г.Слонім.

ПАМЯЦЬ

На талаку!

Калі кожны загляне ў свой радавод, распытае бацькоў, дзядуль і бабуль, то даведаецца, што ў змрочна-крывавыя 30—40-я гады і ягоных продкаў бальшавіцкая ўлада катавала ў шматлікіх засценках, страляла ў шматлікіх Курапатах, гнаіла ў шматлікіх ГУЛАГах. Памяць аб іх болем адгукаецца ў кожным сумленным чалавеку. І сёння, хоць столькі часу мінула, нельга быць абыякавымі, рабіць выгляд, што цябе асабіста народная трагедыя не тычыцца. Святы хрысціянскі абавязак — шанаваць памяць бязвінных ахвяр сталінскага тэрору. Гэта значыць — паставіць крыж памяці ў месцах пахавання пакутнікаў ці ахвяраваць грошы на яго, запаліць свечку, прыйсці на талаку, каб прыбраць святыя магілы, ачысціць ад смецця і кустоўя тэрыторыю Народнага мемарыяла ў Курапатах.

Кожны хаця б раз на год (а лепш і часцей) можа адкласці асабістыя справы, узяць з сабой рыштунак (сякеру, рыдлёўку ці асабліва патрэбную зараз касу ці бензакасу) і прыйсці дзеля сумеснай працы людзей сумлення ў Курапацкае ўрочышча.

Талокі адбываюцца тут штосуботу а 11-й гадзіне (праезд аўтобусамі (№№87, 35 і 13, тралейбусамі №№1, 46 і 53 да канцавога прыпынку (Зялёны Луг-7). Мемарыял — адразу праз пераход пад МКАД, злева ад гандлёвага цэнтра “Экспабел”.

Далучайцеся, шаноўныя сябры!

Разам мы збережам нашу святыню дзеля нашчадкаў і гісторыі Бацькаўшчыны.

Алесь ЧАХОЛЬСКІ,
старшыня камісіі Сойму па Курапатах і Чарнобылю Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ.
Кантактныя тэлефоны:
МТС — 772-62-21;
Velkom — 124-46-86.

Зянон ПАЗЬНЯК

Дарога сьмерці

(З кнігі вершаў і фатаграфій “Дарога”)

Праз Курапаты, дзе ляжыць расстраляны народ, нашчадкі адных праклалі шырокую дарогу нашчадкам другіх. Тады я напісаў:

Не забывайцеся,
Вы ездзіце па магілах,
Дарогай,
якую зрабіў
забойца.

2002 г.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Дзякуй!

Перадаплату за будучыя нумары “Народнай волі” можна зрабіць у любы дзень

Шаноўныя сябры!

Дзякуй Вам за прыхільнасць да “Народнай волі” — і ў другім паўгоддзі мы застаемся разам. Ваш давер натхняе нас на творчы пошук новых тэм, падрыхтоўку цікавых, змястоўных, вострых матэрыялаў.

Спадзяемся на пашырэнне чытацкай аўдыторыі. Зыходзячы з гэтага і працягваем друкаваць узоры плацежных дакументаў і абаненцкай карткі па **перадаплаце** за нумары наступных месяцаў.

Паўтараем: не маеце магчымасці заплаціць за нумары ўсіх шасці месяцаў — зрабіце **перадаплату** за любы тэрмін: за месяц, два, тры...

Агітуйце за “Народную волю” блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом “Народнай волі”, паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна да канца года), **тэрмінова** наведайце любы філіял “Беларусбанка”, а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Банкаўскія рэквізіты “Народнай волі” такія:

УП “Народная воля”: р/р 3012006535014, ААТ “Пріорбанк”, ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами*** *и* ***обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *д.,в.,к.г.* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Галівуд яшчэ пазнае...

Андрэй Курэйчык падпісаў кантракт на стварэнне сцэнарыя з амерыканскай кінакампаніяй “Permanent Residence Productions”.

Як паведаміў драматург БелаПАН, пры ўдзеле гэтай кінакампаніі створаны многія расійскія фільмы, дзеянне якіх адбываецца ў Амерыцы (“Брат-2", ”Рускія ў горадзе анёлаў" і інш.). Паводле яго слоў, сцэнарый фільма будзе арыентаваны на заходні рынак, і здымацца ў ім будуць заходнія артысты. *“Гэта будзе трылер, дзеянне якога адбываецца ў асноўным у Ніцы (Францыя),* — паведаміў А.Курэйчык. — *Галоўная гераіня — руская дзяўчына, якую падманам вывозяць на Захад, і чалавек, з якім яна ад’язджае, — серыйны забойца”.* Працу над сцэнарыем драматург павінен завяршыць на працягу двух-трох месяцаў, а здымкі карціны пачнуцца ў сакавіку 2008 года.

Апрача таго, цяпер ідзе падрыхтоўка да першага здымачага дня карціны “Юлечка. Зло” рэжысёра Аляксандра Стрыжэнава, сцэнарый да якога таксама напісаў А.Курэйчык. Як раней паведамляў БелаПАН, на галоўную ролю запрошаны расійскі акцёр Марат Башараў, герой якога “сутыкнецца з самым нечаканым увасабленнем зла на зямлі”. Нагадаем, вопыт папярэдняга супрацоўніцтва А.Курэйчыка і А.Стрыжэнава быў удалым — камедыя “Любоў-морковь” зарабіла ў пракаце СНД больш за 13 млн долараў ЗША і стала самай прыбытковай камедыяй расійскага кіно.

А.Курэйчык таксама паведаміў, што пачаў працаваць над сваім першым раманам. *“Я даўно хацеў паспрабаваць сябе ў жанры вялікай прозы,* — патлумачыў ён. — *Апрача таго, пасля прэм’еры карціны ”Любоў-морковь" у Расіі выйшла кніга паводле сюжэту гэтага фільма, і я вырашыў больш гэтай справы нікому не давяраць”.* Першы раман, паводле яго слоў, будзе звязаны са сцэнарыем фільма “Юлечка. Зло”, але не будзе яго паўтараць, а пакажа аўтарскае бачанне гэтай гісторыі.

Кажучы аб драматургіі, А.Курэйчык паведаміў, што на пачатку ліпеня адбылася прэм’ера спектакля паводле яго п’есы ў Варшаве ў тэатры “Старая парахаўня”. Пастаноўка “Неба” — першая за апошнія гады прэм’ера беларускага спектакля ў гэтым тэатры. Дагэтуль п’еса была апублікавана ў польскім часопісе “Дыялог”. Паводле яе быў зняты тэлеспектакль для польскага тэлеканала “Культура”.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб’явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА “Типография Михайлова - С”, 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА “Типография Михайлова”, 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 18.07.2007 у 16.00. Аб’ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №